Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 21 1933 г. АУТОРАК № 257 (4801)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АСЕННЯ-ЗІМОВЫ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ ПРАВЕСЦІ СВАЯЧАСОВА І ДОБРАЯКАСНА

«Нельга бясконца, г. зн. на працягу поўтага перыяду часу базаваць совецкую ўладу і социялістычнае будаўніцтво на двух розных асновах: на основе самай буйнай і аб'ядканай социялістычнай прамысловасці і на основе самай раздробленай і адсталай дробна-таварнай селянскай гаспадаркі. Трэба паступова, але сістэматычна і ўпарта пераводзіць сельскую гаспадарку на НОВУЮ ТЭХНІЧНУЮ БАЗУ, на базу буйнай вытворчасці, падцягваючы яе да социялістычнай прамысловасці» (СТАЛІН).

Гэта указанне правадыра, увасобленае ў плане першай пяцігодкі, зрабілася праграмай барацьбы партыі за механізацыю земляробства, за социялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Задача, высунутая тав. СТАЛІНЫМ, паспяхова вырашана партыяй. Сельская гаспадарка пераведзена на новую тэхнічную базу.

Зараз социялістычная вёска ўзброена 200 тысяч трактараў магутнасцю каля 3 млн. конскіх сіл. Разам із трактарам на вёсцы з'явіліся такія складаныя машыны, як трактарныя плугі, трактарныя сеялкі і інш. інвентар. Трактар з'явіўся магутнай зброяй партыі ў справе арганізацыйна-гаспадарчага умацавання колгасаў, у барацьбе за высокі ўраджай, за большэвіцкія колгасы.

Поспехі, дасягнутыя партыяй у гэтым годзе, з'яўляюцца сур'ёзным заваяваннем на шляху ператварэння ўсіх калгасаў у большэвіцкія, а ўсіх калгаснікаў у заможных. Гэта задача не вырашаецца на працягу аднаго с.-г. года. Тут патрэбны намаганні на працягу пэўнага часу, як указваў у сваёй прамове на з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў т. СТАЛІН.

Таму ўжо зараз трэба падрыхтаваць умовы да яшчэ больших заваяванняў у будучым годзе, дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю. Аднак, ажыццяўленне задачы далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі, павышэння ўраджайнасці, барацьба за большэвіцкія калгасы і калгасную заможнасць немыслімы без асваення той вялізарнай па сваёй колькасці і якасці тэхнікі, якую атрымала вёска за апошнія гады ад пролетарскай дзяржавы.

У значнай меры ажыццяўленне гэтых задач будзе залежыць ад таго, наколькі свачасова падрыхтаван будзе да веснавой пасеўнай кампаніі 1934 го да трактарны парк.

У практыцы палявых работ г. г. мы налічвалі нямала выпадкаў, калі трактары пасля рамонта працавалі па некалькі дзён і выходзілі са строя, з прычыны нізкай якасці рамонта.

У святле гэтага выключнае значэнне мае пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб падрыхтоўцы да зімовага рамонта трактараў і будаўніцтва МТМ. Створыўшы неабходную рамонтную базу, партыя і ўрад патрабуюць ад Наркамзема і яго органаў на месцах большэвіцкага аперацыйнага кіраўніцтва рамонтам трактараў. Нельга дапусціць практыку мінулага года, калі за рамонт трактараў у радзе раёнаў узяліся ў студзені, або нават у лютым.

Першыя тыдні рамонтнай кампаніі сігналізуюць аб тым, што пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР выконваюцца зусім нездавальняюча. Аб гэтым з усёй відавочнасцю сведчыць той факт, што план рамонта трактараў у лістападзе з першых-жа дзён зрываецца. За першую палову лістапада замест 235 трактараў адрамантавана толькі 66.

Узяць хоць-бы ДЗЯРЖЫНСКУЮ МТМ. За першыя дзве дэкады лістапада майстэрня павінна была адрамантаваць 7 трактараў і 19 матораў. На справе не адрамантован ні адзін матор і ні адзін трактар.

Адміністрацыя майстэрні апраўдваецца тым, што няма запасных частак. У сапраўднасці часткі ёсць, але яны ляжаць на ст. Дзяржынск, а МТМ не мае аўтамашыны для таго, каб перавезці іх. Другая прычына зрыва рамонта — гэта адсутнасць каленчатых валаў. Каленчатыя валы, аказваецца, таксама ёсць, іх выробляе аршанская майстэрня. Валы гатовы, але яны не наміроўваюцца ў Дзяржынск па той прычыне, што дагэтуль дзяржынская майстэрня не перавяла грошы ў Оршу за валы.

Прыклад Дзяржынскай МТМ не адзіны. Такога-ж парадка факты маюць месца і ў радзе іншых МТМ.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове далі вычарпальныя ўказанні аб тым, як і хто павінен забяспечыць нармальныя ўмовы для работы майстэрань. Праверка-ж паказала, што НАРКАМЗЕМ, НАРКАМФІН, БУЛЬБАТРАКТАРАЦЭНТР з першых-жа дзён не выконваюць пастаноў партыі і ўрада, з першых-жа дзён рамонт трактараў затрымліваецца па віне аппарата цэнтральных і мясцовых устаноў з прычыны выключна бюракратычных адносін да гэтай важнейшай справы.

У радзе выпадкаў бюракратызм даходзіць да простага сабатажа. Мы маем на ўвазе адносіны БУЛЬБАТРАКТАРАЦЭНТРА да забеспячэння нармальнай работы віцебскай МТМ. Не гледзячы на неаднаразовыя ўказанні Наркамзема аб необходнасці забеспячэння віцебскай МТМ запчастамі, перакідкі гэтых запчастак з Менску, дырэктар Бульбатрактарацэнтра т. ГРАБЕНЧЫК упарта сабатуе гэтую дырэктыву.

Не зусім добра і ў саміх МТМ. Дагэтуль яшчэ не закончана камплектаванне рабочай сілы, слабая працоўная дысцыпліна, няма адказнасці за рамонт, дэфектныя ведамасці на прыбываючыя машыны складаюцца вельмі нядбайна. Усё гэта, зразумела, адбіваецца на тэмпах рамонта.

На фоне гэтых фактаў асаблівае значэнне набывае ліст рабочых аршанскай МТМ да ўсіх рабочых і ІТР машынна-трактарных майстэрань БССР, які апублікаваны ўчора ў «ЗВЯЗДЗЕ».

— Мы зразумелі — пішуць яны — што рамонт трактараў такі-ж самы фронт барацьбы за ўраджай, што поспех палявых работ вырашаецца не толькі на калгасных палях, але і ў трактарных майстэрнях. Рабочыя аршанскай МТМ адзначаюць недахопы ў сваёй рабоце і тут-жа выказваюць канкрэтныя мерапрыемствы для іх знішчэння. Яны выказваюць каляндарны план рамонта па месяцах і па дэкадах, устанаўляюць штодзённае дакладнае заданне да брыгады і верштата і скарачаюць тэрміны рамонта. Бяручы на сябе гэтыя абавязацельствы, яны звяртаюцца да ўсіх рабочых і ІТР машынна-трактарных майстэрань БССР пасведамляць іх прыкладу і ўключыцца ў спаборніцтва на хутчэйшае і добраякаснае правядзенне рамонта.

Гэты ліст аршанскіх рабочых павінен знайсці самы жывы водгук ва ўсіх МТМ БССР. Уключыцца ў спаборніцтва на лепшае правядзенне рамонта — галавая задача кожнай МТМ, кожнага рабочага і ІТР з тым, каб адказаць аршанцам канкрэтнымі большэвіцкімі справамі.

У зімовай праграме палітаддзельскай работы рамонту трактараў павінна быць аддана максімальнае месца.

Разгортванне партыйна-масавай работы ў майстэрнях, сканцэнтраванне гаўпоўнага ўпора на арганізацыі шырокага спаборніцтва ў рамонтных брыгадах, на авангардная роля комуніста на вытворчасці — вось адзін з важнейшых участкаў палітаддзельскай работы на зімовы перыяд.

Вялізарная роля ў паспяховым разгортванні асенняга-зімовага рамонта належыць і комсамолу. Ініцыятар социялістычнага спаборніцтва — комсамол — павінен і тут праявіць максімум здольнасцей і ўмення ўзмацніць вытворчы ўздым рабочых і ІТР.

3.083 трактары павінны прапусціць за зіму майстэрні БССР, з іх 1527 — праз капітальны рамонт. Добрасумленна і ў тэрмін выконваць гэтае дзяржаўнай важнасці заданне можна толькі пры ўмове карэннага паляпшэння сістэмы кіраўніцтва гэтай справай. Трэба памятаць, што свачасовы высокаякасны зімовы рамонт трактараў з'яўляецца цэнтральнай задачай усіх арганізацый да веснавой пасеўнай кампаніі 1934 года.

Мы маем усе магчымасці, каб у гэтым годзе правесці зімовы рамонт трактараў лепш, чым калі-б там ні было. Справа толькі ў тым, каб гэтыя магчымасці поўнасцю скарыстаць з большэвіцкай настойлівасцю і ўпартасцю.

Аб ходзе рэалізацыі пастаноў ЦК і СНК БССР па дапамозе бескароўным калгаснікам у набыцці кароў

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае зусім нездавальняючы ход выканання пастановы ЦК і СНК аб дапамозе бескароўным калгаснікам. На 10-XI—33 г. па 72-х раёнах перадана цялят калгаснікам з МТФ і апрамаджанага стада калгасаў — 3.621 шт.—36,2 проц. плана па апрамаджанаму стаду, куплена і закантрактавана 1.448 — 5,1 проц.; а ўсяго 5.491 цёлка або 14,5 проц. па ліку бескароўных.

Рад РК КП(б)Б і РВК апартуністычна адносіўся да гэтага важнейшага палітычна-гаспадарчага мерапрыемства, не мабілізавалі партыйную арганізацыю і масы саміх калгаснікаў і аднаасобнікаў на гэту справу, абмежаваўшыся канцылярска-бюракратычнымі [illegible] Худзенага спаборніцтва і кантрактацыі. Ушацкі, Дубровенскі, Чырвонапольскі раёны яшчэ не прыступілі да кантрактацыі і перадачы цялят. У радзе раёнаў пралічены значэнне-нізкайшыя адносіны да закупкі і кантрактацыі цёлак. Па Лепельскаму раёну перадана 4 цялят, Суражскаму — 4, Асіпавіцкаму — 6, Старобінскаму — 7, Тураўскаму — 2. Па Сенненскаму раёну нават планы кантрактацыі спушчаны на ўсіх калгасах. Па Пустынскаму сельсовету з 17 калгасаў план даведзен толькі да 13-ці калгасаў. Калгас «Полымя» мае 6 бескароўных — план зусім не спушчан, калгас Пушкары гэтага-ж сельсовета замест цялят раздаў дарослых кароў.

Асобныя праўленні калгасаў — «Баец» і «1 мая» — Барысаўскага раёна, «Рассвет-пераможца» — Жлобінскага раёна, рад калгасаў у Крычаўскім, Чаўускім, Магілеўскім і інш. раёнах дамагаюцца дачы згоды не выдачу бескароўным калгаснікам кароў і нецёлаў, што не мае належнага адпора з боку РК і РВК.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За абсалютную бяздзейнасць, ігнараванне дырэктыў ЦК і СНК БССР аб дапамозе бескароўным калгаснікам паставіць на від сакратарам райкомаў Сенненскага раёна — т. ЛЕНЦНЕРУ, Ушацкага раёна — т. ТАРАСЕВІЧУ, Дубровенскага раёна — т. КАЦМАНУ і Чырвонапольскага раёна — т. ЛАПАЦІНУ, а таксама старшыням РВК: тав. ЛЯСОВІЧУ (Ушачы), т. СЯМАШКА (Дуброўна) і КІРЭЕВУ (Чырвонаполье).

Загадчыкам райза — т. т. КАЧУКУ (Сянно), ЖУКАВУ (Ушачы), КЛАСОЎСКАМУ (Чырвонаполье) — абвясціць вымову.

ЦК папярэджвае партыйныя арганізацыі, што перыяд надзялення бескароўных калгаснікаў цёлкамі з'яўляецца неадкладнай важнейшай задачай і што сакратары райкомаў, старшыні РВК, нач. палітаддзелаў МТС нясуць за гэта персональную адказнасць.

2. Абавязаць сакратароў РК, начальнікаў палітаддзелаў і дырэктароў МТС арганізаваць да 25-га лістапада куставы злёты бескароўных калгаснікаў сумесна з калгаснікамі і аднаасобнікамі, мачымі цёлак, для правядзення масавай работы па інструктажы і продажы цёлак бескароўным.

3. Абавязаць сакратароў РК сумесна з нач. палітаддзелаў на бліжэйшым пасяджэнні бюро і не пазней 25-XI заслухаць даклад загад райза аб ходзе выканання пастановы аб дапамозе бескароўным калгаснікам з тым, каб дабіцца рашэння пералома ў справе выканання адзначанай пастановы. Выступіць у кожным раёне адказных упаўнаважаных райкомаў па рашаючых сельскагаспадарчых тэрмінам да поўнага выканання ўсяго плана і ўсялякасці на іх персональную адказнасць за выкананне задання.

4. Заслухаць у ЦК на працягу чарговай дэкады даклады 5 сакратароў РК найбольш адсталых раёнаў, аб ходзе выканання адзначанай пастановы. Т. т. ШАРАНГОВІЧУ і БЕНЕКУ ўстанавіць раёны.

5. Пад асабістую адказнасць старшынь РВК устанавіць 5-дзённую тэлеграфную справаздачнасць РВК НКЗ БССР аб ходзе надзялення бескароўных.

6. Адзначаючы налічваюць кулацкага супраціўлення з боку правядзення комуны БВА, Любаньскага раёна, Дняпроўскай комуны, Рэчыцкага раёна, калгаса «Рассвет-пераможца», Жлобінскага раёна і раду іншых да ініцыятыва бескароўных калгаснікаў цёлкамі і патрабаванні выдачы бескароўным дарослых кароў з ферм і апрамаджанага стада калгасаў, папярэдзіць раённыя арганізацыі, што камуністы і калгаснікі незалежна ад апрамаджання іх кароў пры ўступленні ў калгас, надзяляюцца цёлкамі на агульных падставах.

7. Прапанаваць рэдакцыям газет «Звязда» і «Рабочий» рэгулярна (па пяцідзённках) друкаваць пазаёмныя зводкі выканання пастановы аб дапамозе бескароўным калгаснікам.

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СОЦСПАБОРНІЦТВУ БССР З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Па групе ІЛЬНАВОДЧЫХ раёнаў пераходны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР павінуць за ДРЫСЕНСКІМ раёнам, выканаўшым на 15 лістапада гадавы план ільназагатовак на 64,7 проц. Аспрачваюць у ДРЫСЫ пераходны сцяг раёны: СЕННЕНСКІ (43,4 проц.) і ПОЛАЦКІ (40 проц.).

Па групе ЗБОЖЖАВЫХ раёнаў. За адставанне па натураплаце МТС і збожжапастаўках па соўгасах адабраць ад АРШАНСКАГА раёна пераходны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР і перадаць яго БЯГОМЛЬСКАМУ раёну, які па збожжапастаўках, натураплаце і звароту насенной пазыкі выканаў план на 100 проц.

За адставанне па натураплаце МТС, па звароту насеннапазыкі і збожжапастаўках па соўгасах адабраць ад БАРЫСАЎСКАГА раёна пераходны сцяг ЦВК БССР і перадаць яго АСІПАВІЦКАМУ раёну, выканаўшаму збожжапастаўкі і зварот насеннапазыкі на 100 проц.

За ганебнае адставанне ў ільназагатоўках і ў ільнаапрацоўцы занесці на чорную дошку наступныя раёны: МСЦІСЛАЎСКІ, ГОРАЦКІ, ДУБРОВЕНСКІ, СУРАЖСКІ, КРУПСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ.

Даручыць упаўнаважаным ЦК, выехаўшым у пералічаныя раёны па пытаннях ільназагатовак, да 25 лістапада паведаміць Цэнтральную камісію па соцспаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю аб прычынах адставання гэтых раёнаў.

Па лініі «Звязды» накіраваць газетных работнікаў у Крупскі і Чырвонапольскі раёны для разгорнутага паказа прычын нецярпімага адставання даных раёнаў у ільнаапрацоўцы і ільназагатоўках.

КАМІСІЯ ПА СОЦСПАБОРНІЦТВУ БССР З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ.

ЧОРНАЯ ДОШКА

зрыўшчыкаў Ільнаапрацоўкі і Ільназагатовак

Цэнтральная камісія па соцспаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю пастанавіла за зрыў Ільнаапрацоўкі і ільназагатовак занесці на чорную дошку наступныя раёны:

МСЦІСЛАЎСКІ, ГОРАЦКІ, ДУБРОВЕНСКІ, СУРАЖСКІ, КРУПСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ.

УСТАНАЎЛЕННЕ НАРМАЛЬНЫХ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ САЮЗАМ ССР І ПАЗШ

Зварот т. М. І. КАЛІНІНА па радыё да амерыканскага народа

МАСКВА, 20. (БЕЛТА).

20-ГА ЛІСТАПАДА Ў 18 ГАДЗІН (ПА МАСКОЎСКАМУ ЧАСУ) СТАРШЫНЯ ЦВК СССР ТАВ. М. І. КАЛІНІН ВЫСТУПІЎ ПА РАДЫЁ З ПРАМОВАЙ, ПРЫСВЕЧАНАЙ УСТАНАЎЛЕННЮ НАРМАЛЬНЫХ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ СССР І ПАЗШ.

ПРАМОВА ТАВ. КАЛІНІНА ПЕРАДАВАЛАСЯ ПРАЗ АМЕРЫКАНСКУЮ РАДЫЁВЯЩЧАЛЬНУЮ КАМПАНІЮ Ў Н'Ю-ЮРКУ І ТРАНСЛЯВАЛАСЯ ЎСІМІ АМЕРЫКАНСКІМІ РАДЫЁ-СТАНЦЫЯМІ. АДНАЧАСОВА ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВ. КАЛІНІНА ТРАНСЛЯВАЛАСЯ ПА САЮЗУ.

ТАВ. КАЛІНІН СКАЗАЎ:

«ГРАМАДЗЯНЕ І ГРАМАДЗЯНКІ ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ!

У МОМАНТ УСТАНАЎЛЕННЯ НАРМАЛЬНЫХ АФІЦЫЯЛЬНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ НАШЫМІ ДВУМА ДЗЯРЖАВАМІ Я РАД АД ІМЯ НАРОДАЎ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК ПЕРАДАЦЬ САРДЭЧНАЕ ПРЫВІТАННЕ НАРОДУ ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ АМЕРЫКІ.

ПРАЦОЎНЫЯ ГАРАДОЎ І СЁЛ СОВЕЦКАГА САЮЗА НА ПРАЦЯГУ МІНУЎШЫХ 16 ГОД ПАКАЗАЛІ ЎСЯМУ СВЕТУ ЎЗОРЫ ВЯЛІЗАРНАЙ ТВОРЧАЙ РАБОТЫ. НАПРУЖАНЫМІ НАМАГАННЯМІ ЯНЫ Ў КАРОТКІ ТЭРМІН ПЕРАТВАРЫЛІ НАШУ КРАІНУ З АДСТАЛАЙ АГРАРНАЙ У ПЕРАДАВУЮ ІНДУСТРЫЯЛЬНУЮ, І ІМЕННА ТАМУ НАШЫ РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ З НАЙВЯЛІКШАЮ ЦІКАВАСЦЮ І ЎВАГАЮ АДНОСЯЦЦА ДА ПЕРАДАВОЙ КРАІНЫ ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСА — ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ АМЕРЫКІ.

САМАЙ ВАЖНАЙ УМОВАЙ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ТЭХНІЧНАГА ПРАЦЭСА І ДАБРАБЫТА ЛЮДЗЕЙ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЗАХАВАННЕ І ЎМАЦАВАННЕ МІРА ПАМІЖ НАРОДАМІ. Я ЎПЭЎНЕН, ШТО ЦЯПЕР, КАЛІ АДХІЛЕНЫ ЎСЕ ШТУЧНЫЯ ПЕРАШКОДЫ ДЛЯ ПОЎНЫХ І РОЗНАСТАЙНЫХ ЗНОСІН ПАМІЖ НАРОДАМІ НАШЫХ ДВУХ ВЯЛІКІХ КРАІН, ГЭТА ПРЫНЯСЕ ВЯЛІЗАРНУЮ КАРЫСЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ІХ УЗАЕМНЫМ ІНТАРЭСАМ, АЛЕ І СПРАВЕ ЭКАНАМІЧНАГА І КУЛЬТУРНАГА ПРАГРЭСА ЧАЛАВЕЦТВА І СПРАВЕ ЎМАЦАВАННЯ ЎСЕАГУЛЬНАГА МІРА.

Я ЦВЁРДА ВЕРУ, ШТО З ГЭТАГА ЧАСУ АДКРЫВАЕЦЦА ЭРА РОЗНАСТАЙНАГА І ПЛАДАТВОРНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ НАШЫМІ НАРОДАМІ. Я ЎПЭЎНЕН, ШТО РАДАСЦЬ, ЯКУЮ МЫ АДЧУВАЕМ ПА ГЭТАМУ ПОВАДУ, ПАДЗЯЛЯЕЦЦА ВА ЎСІМ СВЕЦЕ ЎСІМІ, КАМУ ДОРАГА СПРАВА ПРАГРЭСА ЧАЛАВЕЦТВА І СПРАВА МІРА ПАМІЖ НАРОДАМІ».

ТАВ. КАЛІНІН СКАЗАЎ СВАЮ ПРАМОВУ НА РУСКАЙ МОВЕ, А ЗАТЫМ ПА РАДЫЁ БЫЎ ЗРОБЛЕН ПЕРАКЛАД ПРАМОВЫ НА АНГЕЛЬСКУЮ МОВУ.

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВ. КАЛІНІНА ПА РАДЫЁ АДБЫЛОСЯ З ГАБІНЕТА НАРОДНАГА КАМІСАРА СУВЯЗІ ТАВ. РЫКАВА. НА ВЫСТУПЛЕННІ ПРЫСУТНІЧАЛІ: ТАВ. РЫКАЎ, АДКАЗНЫЯ РАБОТНІКІ НКЗС, АМЕРЫКАНСКІЯ ЖУРНАЛІСТЫ І ПРАДСТАЎНІКІ СОВЕЦКАГА ДРУКУ.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ ПА РАДЫЁ М. І. КАЛІНІН НА ПРАЦЯГУ 20 МІНУТ ГУТАРЫЎ З АМЕРЫКАНСКІМІ ЖУРНАЛІСТАМІ, ЯКІЯ ЗВЯРНУЛІСЯ ДА ЯГО З РАДАМ ПЫТАННЯЎ АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ РАЗВІЦЦЯ СОВЕЦКА - АМЕРЫКАНСКІХ АДНОСІН.

ПА ПРОСЬБЕ АМЕРЫКАНСКАЙ РАДЫЁ-ВЯЩЧАЛЬНАЙ КАМПАНІІ ЎЧОРА БЫЛА АДПРАЎЛЕНА Ў Н'Ю-ЮРК ТЭЛЕГРАМА З ДАКЛАДНЫМ ТЭКСТАМ ПРАМОВЫ ТАВ. КАЛІНІНА.

АБ НАЗНАЧЭННІ тав. ТРАЯНОЎСКАГА А. А. ПАЎНАМОЧНЫМ ПРАДСТАЎНІКОМ САЮЗА ССР У ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ АМЕРЫКІ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР пастанаўляе:

Назначыць т. ТРАЯНОЎСКАГА АЛЕКСАНДРА АНТОНАВІЧА паўнамочным прадстаўніком Саюза ССР у Злучаных Штатах Амерыкі.

Старшыня ЦВК Саюза ССР М. КАЛІНІН

Сакратар ЦВК Саюза ССР А. ЕНУКІДЗЕ

Масква, Крэмль, 20-XI-33 г.

ВОДГУКІ СУСВЕТНАЙ ПРЭСЫ

ІТАЛІЯ

СССР УМАЦОЎВАЕ СПРАВУ МІРА

РЫМ, 19 лістапада. (БЕЛТА).

«Джорналь дэ Італія», адзначаючы, што цяпер трэба чакаць ажыўлення эканамічных адносін паміж СССР і ПАЗШ, піша:

«У галіне агульнай палітыкі можна без хістання сцвярджаць, што совецкі ўрад яшчэ больш умацуе сваё міжнароднае становішча і ўзмоцніць магчымасці свайго ўдзелення па міжнародную палітыку. Павялічэнне вагі совецкай значнай палітыкі неадкладна дасць сябе адчуць пры вырашэнні розных праблем, пачынаючы з праблемы раззбраення і канчаючы праблемамі Далёкага Усхода».

Асаблівай увагі заслугоўвае, што газета падкрэслівае, супадзенне інтарэсаў ПАЗШ, Эўропы і СССР у зацікаўленні міра на Далёкім Усходзе.

«Пополо д'Італія», ацэньваючы магчымыя вынікі ўстанаўлення адносін паміж СССР і ПАЗШ, у прыватнасці для вырашэння ціхаакіянскай праблемы, піша:

«Найбольш важна, што мір умацоўваецца, што Совецкая Расія ўжо сёння робіць ціскі на лёс Эўропы і ўсяго света і што заўтра яе ўплыў яшчэ больш узмоцніцца».

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 19 лістапада. (БЕЛТА).

Каментуючы ўстанаўленне дыпламатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ, «Обсервэр» гаворыць, што дыпламатычныя навіны з Вашынгтона ў такой-жа ступені добрыя, у якой дрэнныя фінансавыя навіны. Устанаўленне адносін з СССР з'яўляецца лепшым дасягненнем Рузвельта.

«Сандэй таймс» падкрэслівае, што Рузвельт устанаўленнем адносін з СССР зноў паказаў свой рэалізм, і палітычная значнасць гэтага крока не пройдзе незаўважанай для тых, хто зацікаўлен у справах Далёкага Усхода.

Аднак, на думку газеты Рузвельт, несумненна, выходзіў перш за ўсё з эканамічных меркаванняў, устанаўліваючы нармальныя адносіны з СССР.

СССР мае патрэбу ў вялізарнай колькасці машын, а НРА (адміністрацыя па аднаўленню прамысловасці) мае вялікую патрэбу ў пашырэнні збыту амерыканскіх тавараў.

—«Варта ўвагі,—піша газета,—тое, што гэтыя дзве вялізарныя краіны, якія прарабілі шырокія эканамічныя эксперыменты, знайшлі агульную мову. З цягам часу вынікі ўсяго гэтага набудуць вялікае значэнне».

Паводле слоў «Рэйнолдса» Літвінаў да сваіх бліскучых поспехаў 1933 года дадаў яшчэ адзін. Газета лічыць, што совецка-амерыканская згода будзе мець далёка ідучыя вынікі.

ГАЛАНДЫЯ

АМСТЭРДАМ, 19 лістапада. (БЕЛТА)

Галандскі друк аднадушна канстатаваў, што ўстанаўленне афіцыяльных адносін паміж СССР і ПАЗШ з'яўляецца для СССР вялізарным поспехам, увянчаўшым рад дыпламатычных дасягненняў СССР у апошні час.

Газеты асабліва падкрэсліваюць дыпламатычны талант Літвінава.

Уплывовая «Н'ювэ ротэрдамшэ курант», выказваючы нездавальненне тым, што Галандыя цяпер у выключным становішчы ў сваіх адносінах з СССР, заяўляе, што дзеянні ПАЗШ, «відавочна з'явяцца ўзорам для іншых дзяржаў».

Ганцлёвая палата Гаарлема звярнулася да ўрада з просьбай уступіць у перагаворы з СССР для пашырэння ганцлёвых адносін паміж абодвума краінамі.

ШВЕЦЫЯ

СТАКГОЛЬМ, 18 лістапада. (БЕЛТА).

Каментуючы прызнанне Злучанымі Штатамі СССР, шведскі друк адзначае сусветнае значэнне гэтай падзеі і расцэньвае яго, як вялізарны поспех знешняй палітыкі СССР.

«Социял-дэмакратэн» думае, што СССР адолее дабіцца лепшых поспехаў у сваіх адносінах з Польшчай, Францыяй, а таксама з балканскімі краінамі, якія да гэтага часу ўстрымліваюцца ад фармальнага прызнання.

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

КАМПАНІЯ Ў ЧЭХАСЛАВАЦКІМ ДРУКУ ЗА ПРЫЗНАННЕ САЮЗА ССР

ПРАГА, 19 лістапада. (БЕЛТА).

Устанаўленне дыпламатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ у цэнтры ўвагі чэхаславацкага друку.

Усе газеты бачаць у гэтай падзеі факт першаступеннай важнасці і прыходзяць да вываду, што Чэхаславакія павінна неадкладна прызнаць СССР.

Адзначаючы катастрафічнае падзенне гандля паміж Чэхаславакіяй і СССР, газеты падкрэсліваюць, што «маючы амерыканскія крэдыты, СССР будзе мець патрэбу ў Чэхаславакіі яшчэ менш, чым зараз».

Абрушваючыся на адзіных працаўнікаў прызнання СССР — нацыянал-дэмакратаў, якія трымаюць ролю цёрпадобных слепаноў, газета «Право лиду» заклікае прайсці міма іх і зрабіць тое, што дыктуюць эканамічныя інтарэсы.

АЎСТРЫЯ

ВЕНА, 18 лістапада. (БЕЛТА).

Аўстрыйскі друк на вішным месцы друкуе паведамленне аб прызнанні Совецкага Саюза Злучанымі Штатамі.

«Нэйе фрэйе прэсе» расцэньвае прызнанне Совецкага Саюза ПАЗШ, як пашырэнне ПАЗШ на адрасу Японіі, а таксама як доказ надзвычайнай гібкасці знешняй палітыкі Совецкага Саюза.

АРГЕНТЫНСКІЯ ДЗЕЯЧЫ ПАТРАБУЮЦЬ АД УРАДА ПРЫЗНАННЯ СССР

ВАШЫНГТОН, 19 лістапада (БЕЛТА).

Згодна паведамлення з Буэнос-Айраса (Аргентына), былы аргентынскі паслянік у ПАЗШ Пуэрродон і іншыя відныя дзеячы настойваюць, каб аргентынскі ўрад прызнаў СССР.

ПРАБЫВАННЕ М. М. ЛІТВІНАВА У ВАШЫНГТОНЕ

ВАШЫНГТОН, 19 лістапада (БЕЛТА).

Учора тав. Літвінаў наведаў міністэрства фінансаў, дзе меў кароткую гутарку з в. а. міністра фінансаў Моргентау.

ПРЫВІТАННЕ ЭРЫО

ВАШЫНГТОН, 19 лістапада (БЕЛТА).

Тав. Літвінаў, па-ранейшаму, атрымлівае сотні віншавальных лістоў і тэлеграм ад рабочых арганізацый, ад культурных арганізацый, ад асобных прамыслоўцаў і дзяржаўных дзеячоў Эўропы.

ЭРЫО прыслаў тэлеграму:

«САРДЭЧНЫЯ ВІНШАВАННІ ПА ПОВАДУ ВАШАГА БЛІСКУЧАГА ПОСПЕХА».

Тав. Літвінаў адказаў удзячнаю тэлеграмаю.

* * *

ТОКІО, 20 лістапада. (БЕЛТА)

Сёння паўнамочны прадстаўнік тав. ЮРЭНЕЎ і амерыканскі пасол ГРЮ абмяняліся фармальнымі візітамі.

* * *

ВАШЫНГТОН, 19 лістапада.

В. а. міністра замежных спраў Філіпс заявіў, што на пост таварыша міністра замежных спраў назначаецца прафесар юрыдычных навук Гарвардскага ўніверсітэта Сейр.

Згодна паведамлення «Н'ю-Юрк таймс», Сейр будзе займацца галоўным чынам пытаннямі, якія адносяцца да ганцлёвых перагавораў.

Паводле слоў газеты ён «уступае на пост у спрыяльны час, калі трэба будзе выпрацоўваць дагаворы з СССР. Ёсць мала дагавораў (або іх яма зусім), якімі прадугледжаны-б эканамічныя магчымасці такога маштаба».

* * *

Н'Ю-ЮРК. (БЕЛТА).

Газеты траста «Окрыпс говардс» у сваіх перадавых падкрэсліваюць, што совецка-амерыканскае збліжэнне выходзіць за рамкі прызнання, прадугледжваючы «далёка ідучае эканамічнае дыпламатычнае супрацоўніцтва».

Філадэльфійская газета «Пэблік джэр» піша:

«Дыпламатычны кантакт палепшыць адносіны. Аднак, трэба ўнікаць перапавялічаных чаканняў у адносінах ганцлёва. Буйныя совецкія замовы не магмы, калі не будзе дапушчан увоз тавараў з СССР».

«Джорнэл оф комэрс», указваючы, што «прызнанне дае магчымасць весці перагаворы аб згодзе наконт ганцлёва і крэдытаў», заклікае ўрад зацвердзіць экспарт у СССР.

ФРАНЦЫЯ ПРАПАНУЕ ГЕРМАНІІ ПРАМЫЯ ПЕРАГАВОРЫ

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАВАС

ПАРЫЖ, 19 лістапада. (БЕЛТА)

«Журналь дэ Жэнэв» апублікавала паведамленне агенцтва Гавас, у якім між іншым гаворыцца:

«У аўтарытэтных колах заяўляюць, што для Францыі Ліга нацый і канферэнцыя па раззбраенню па-ранейшаму існуюць і што ўсякая дзейнасць дыпламатычнага паралку павінна быць завершана ў Жэневе.

Хістанні, якія выявіліся ў апошнія дні ў Англіі, і ўчарашняя прамова Мусаліні, не могуць змяніць гэтай пазіцыі.

Іменна з прычыны вернасці Жэневе, погляды Бонкура прыцягнулі італьянскаму тэзісу, паводле якога спецыяльныя перагаворы паміж буйнымі дзяржавамі павінны падмяняцца жэнеўскія ўстановы, у якіх усе дзяржавы, якія з'яўляюцца членамі Лігі нацый, прымаюць удзел у дыскусіі.

Аднак, застаючыся верным сваёй галоўнай дактрыне, французкі ўрад згаджаецца з магчымасцю прамых перагавораў з Германіяй. Калі Германія хоча зрабіць прапановы няхай сфармулюе іх. Гэтыя прапановы будуць абмеркаваны дыпламатычным шляхам у духу супрацоўніцтва і міжнароднай згоды.

Такім чынам, можна было-б неашкладна прыступіць да перагавораў аб эканамічных адносінах Саарскай вобласці з Францыяй і Германіяй. Гэта праблема павінна быць вырашана незалежна ад рэзультатаў плебісцыта, які павінен адбыцца ў 1935 годзе».

„КАЛІДОР ПАВІНЕН ЗНОЎ НАЛЕЖАЦЬ ГЕРМАНІІ" ПАТРАБАВАННІ ГЕБЕЛЬСА

ЛОНДАН, 19 лістапада. (БЕЛТА).

Фашыстскі журнал «Сатэрдэй рэв'ю» апублікаваў артыкул за подпісам ГЕБЕЛЬСА. У ім указваецца, што бліжэйшая мэта нацыянал-социялістаў — перагляд усходняй граніцы.

«КАЛІДОР ПАВІНЕН ЗНОЎ НАЛЕЖАЦЬ ГЕРМАНІІ І ТАЯ ЧАСТКА СІЛЕЗІІ, ЯКАЯ АДДАНА ПОЛЬШЧЫ, ПАВІННА БЫЦЬ ВЕРНУТА НАМ».

Гебельс у тэлеграме рэдактару журнала адмаўляе аўтэнтычнасць артыкула, але рэдактар «Сатэрдэй рэв'ю» заяўляе, што адзіўлен гэтым адмаўленнем, бо ніводнае слова ў артыкуле не супярэчыць таму, што гаварыў сам Гітлер да яго апублікавання.

Афіцыяльныя герман

13 ПРОЦ. ІЛЬНАТРАСТЫ ПСУЕЦЦА НА СЦЕЛІШЧАХ

СІРОШІНСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, ГАРАДОЦКІ І ГОРАЦКІ РАЁНЫ САБАТУЮЦЬ ДЫРЭКТЫВУ ПАРТЫІ АБ ВЫСОКАЯКАСНАЙ АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ПАДНЯЦЬ УСЮ ТРАСТУ СА СЦЕЛІШЧ

ТРАСТА—ПАД СНЕГАМ

СІРОЦІНА. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

На сценах залы пасяджэнняў Сіроцінскага РК КП(б)Б красуюцца ўзоры ільну ад нумара 14 да нумара 17. Мачанец і сланец. Сівы, фуды і белы як снег. Росныя пятушкі і колеры валакна песцяць вока. Гэта — у памяшканні райкома.

Які-ж лён на загатоўшчыке?

Загадчык канторы Загатільна тав. Кі[illegible]манскі тлумачыць.

— Треба загатовіць паволле задання ў сярэднім не ніжэй 6-га нумара, мы паставілі задачу змагацца за 10 нумар.

Задачу паставілі, але не змагаюцца за не выкананне. На 10 лістапада сярэдні нумар загатоўленага валакна — 6-7.

Глядзім жодку. Треба загатовіць 288 тон валакна, загатоўлена 8 тон, або 2,7 проц.

Загатоўкі трасты ідуць не лепш. Плана — 2.935 тон, загатоўлена 464,7 тон, або 16,8 проц. Ільназаводы не забяспечаны сыравінай.

Ільнянога сеяў па 15 лістапада загатоўлена толькі 83 проц. Зрываюць загатоўкі калгасы МТС: запасае ў 163,5 тоны выканана толькі на 38,5 проц.

Выхад адзін: злачынна дрэнна ідуць загатоўкі як валакна і трасты, так і ільнянога сеяў; недапушчальна нізкая якасць загатоўленай прадукцыі.

Дзе-ж прычыны?

Узяць такую важную справу, як падʼём трасты са сцелішч. ЦК КП(б)Б дасылае дзён таму назад даў тэлеграму: за тры дні закончыць падʼём трасты са сцелішч. Але ў раёне замест большэвіцкіх мер па ратаванні трасты, пачаў разважаць: колькі трасты на сцелішчах, як, ды што з ёю рабіць. Склікалі нараду старшынь сельсаветаў. Тут не паставілі пытання аб неадкладным падʼёме трасты са сцелішч. Тым часам выпаў снег.

— Ну, што-ж, снег выпаў не першы раз. Разыдзецца, падымем... Затое лён добра «вылежыцца» — разважалі ў раённых арганізацыях, сельсаветах і калгасах.

На сцелішчах засталося каля 30 проц. неадпатрэ трасты

А тут пайшоў дождж. Потым пацяплеў марозь. Лён, што стаіць на полі ў снапах, абліп лёдам, што разасланы — таксама пакрыўся ледзяністай коркай.

Треба прыкласці вялізарнейшую энергію, каб выратаваць трасту з-пад снегу. Што-ж робяць у раёне? Зноў разважаюць:

— А можа стане адліга? Можа снег растане?

Каля 30 проц. ільнатрасты ў Сіроцінскім раёне знаходзіцца пад пагрозай псавання. Гэта — рэальная пагроза невыканання плана ільназагатовак, удар па інтарэсах калгасаў і саміх калгаснікаў.

Ці зразумелі ў раёне, што ўсё гэта кладзе на раённае кіраўніцтва, сельсаветы, партячэйкі, працаўніка калгасаў і брыгадзіраў выключную адказнасць? Факты гавораць, што не зразумелі.

Не чакаючы ні хвіліны, треба неадкладна выратаваць можную жменю трасты, падняць са сцелішч, якія-б трудна ці не прыцлюсці пры гэтым нерамітчы.

Звернемся да загатовак. Шматлікія факты гавораць, што дырэкцыя ільназаводаў злачынна адносіцца да златых каў трасты. Фурманкі дзесяткамі ганяцца назад. Часта траста не прымаецца не таму, што яна нізкай якасці, а па злачынаму самадурству прыёмшчыкаў.

Вось характарны прыклад.

Калгас «Кастрычнік», Барашкаўскага сельсавета, накіраваў на ільназавод у Обаль 12 фурманак трасты; там яе не прынялі, фурманкі вярнуліся назад за 12 кілометраў. Незадтра калгас гэту трасту здаў на Вульскі ільназавод (Бешанковіцкі раён), тут яе прынялі за нумар 1,5.

Злачынцы, канкрэтныя вінаватыя ў гэтых збураючых фактах дагэтуль не пакараны.

Але медулны ход загатовак трасты тлумачыцца не толькі тым, што праз мерна бракуюць прывезеную на ільназавод трасту. Есць і другая важная прычына траста ў большасці калгасаў дрэнна сартуецца.

Арганізацыя правільнага сартавання трасты з'яўляецца важнейшым сродкам для ўзмацнення загатовак.

Наконт валакна.

Райжэнарганізатар тав. Мацієўская заяўляе:

— Пяць раз возяць валакно здаваць у Обаль з Барашкаўскага сельсавета, а на загатоўшчыке не прымаюць, адпраўляюць назад. Чаму? Таму, што нізкаякасна апрацавана. А як правільна апрацаваць — ніхто не ведае. З боку загатоўчыка няма дапамогі.

У тым, што апарат Загатільну не стаў арганізаторам ільназагатовак, інструктарам мацця, трапання і сартавання — адна з важнейшых прычын дрэннага хода загатовак валакна ў раёне. Ручная перапрацоўка ільну не арганізавана ў калгасах, не гаворачы ўжо аб аднаасобным сектары, дзе яе таксама трэба арганізаваць.

І, нарэшце, аб ільнасеі. Мы ўжо адзначалі, што калгасы МТС зрываюць загатоўкі ільнасеяя. Гэта вельмі дакорна.

Дырэктар МТС тав. Сінічкін тут нямала пастараўся. Вось якой думкі ён трымаецца і якую тактыку вядзе.

— Некаторыя таварышы думаюць, што мы павінны выказаць план поўнасцю. Гэта памылка. Апрабацыя паверхная: памылілася пры зменах ўрадкаю на корані—вось дакладныя словы тав. Сінічкіна, сказаныя на пасяджэнні бюро РК КП(б)Б.

Треба заўважыць, што гутарка ідзе аб селекцыйным насенні ільну, аб гэтым залатым насенным фондзе. Таму асабліва сур'ёзную адказнасць нясе дырэктар МТС Сінічкін за кулацкую нічым неўгрунтаваную заяву аб «памылцы», пры выкананні плана на 38,5 проц.

Такія агідныя справы творацца ў раёне на вачах РК КП(б)Б і РВК, не сустракаючы жорсткага большэвіцкага адпора.

М. А.

АДГАРАДЗІЛІСЯ „КІТАЙСКАЙ СЦЯНОЙ"

Мы на зазімоўкім дваре. Каля 20 сялянскіх фурманак, нагружаных трастой, чакаюць прыёмкі. Яшчэ аднак чуваць крык, спрэчкі і лаянка паміж здатчыкамі і прыёмшчыкам:

— Я ўсякае дзярмо прымаць не буду, — на ўвесь голас крычыць прыёмшчык.

Падыходзім да стаячых ля вагі першых вазоў.

*

—Чыя траста? — пытаецца дырэктар Гарадоцкага ільназавода тав. СЯМЁНАЎ, і тут-жа знімае з вазоў некалькі снапоў.

— Гэта наша, з калгаса «Чырвоны барацьбіт», траста самага першага сорта,— адказваю маладзы калгаснік па прозвішчы Фёдараў.

Дырэктар тут-жа, па віду на ўсіх, на чынае рабіць сартаванне.

І што-ж? У адным снопе 2/3 аказаліся не вышэй 0,5 і 1/3 — № 1. Ясна, што такую трасту прывяз чельга.

Падыходзім да наступных вазоў. Іх гаспадар — калгас «Чырвоны маяк». Амаль уся траста з пустаяллем. Траста не сартавана. У любым снопе можна знайсці трасту і № 1, і 1,25, і нават № 0,5.

Недалёка стаяць вазы з трастой, пры везеныя калгасам «Чырвоная абідзіна». Зірнуўшы на гэтыя вазы, мімаволі паўстае мысль, што ў калгасе арудуе кулацкая школніцкая рука. Траста амаль не абмалочана. Галоўкі так і тырчаць на кожным сняпе. Яны аказаліся дакладным кормам для мышэй. Разам з галоўкамі мышы пашрылі і трасту. Траста найлепшай якасці № 1,5 — 4,75 прывезена ў поўную нягодзь.

— У нас уся траста такая, чырвоная, заяўляе калгаснік Шлакуноў.

Гаспадаром самай крайняй фурманкі аказаўся аднаасобнік вёскі Стрыжма Васільёў. Ён таксама скарэдзіцца дырэктару на прыёмшчыка, што, бач, анаслі не прымае ў яго прывезеную добрай якасці трасту. А яе сапраўды ні ў якім выпадку прыняць нельга — адна саломка. Забяспечана ён сцелішча.

Дырэктар завода і прыёмшчык з гонарам заявілі.

— Вачыце, як мы з усёй сур'ёзнасцю зварачаем увагу на якасць трасты.

Аднак, дырэктар і прыёмшчык забылі ці на адну «дробязь». У тым, што траста паступае на сартаванне, зесмячаная і нізкай якасці вінават у першую чаргу сам дырэктар, яго апарат, які не здолеў паставіць справы апрацоўкі і сартавання ільну на належную вышыню непасрэдна ў самых калгасах. Па заяве самога дырэктара справай арганізацыі апрацоўкі ільну ў калгасах ніхто не займаецца.

Не дзіва, што ў некаторых калгасах кулацкія агенты адкрыта сабатуюць непрапрацоўку ільну. Напрыклад, у калгасе «Першае мая», Вышадоскага сельсавета, каля 30 га ільну яшчэ не ўзята са сцелішч, знаходзіцца пад снегам і ляжа на вачах у старшыні калгаса Пазанкова. У калгасе «Чырвоная зорка» каля 15 га ільну нават не абмалочана, а большая частка не ўзята.

Вось гэта карэнні таго, што, пачынаючы з верасня, заводам загатоўлена ўсяго 200 тон трасты (гаворка ідзе пра патрэбнасць 1.100 тон) і замест 6 тон высокаякаснага турбіннага валакна і 2 тон кудзельнага выпрацавана 1½ тоны турбіннага і 6 тон кудзельнага. За апошні час тэмпы загатовак яшчэ больш знізіліся. Калі ў другой палове кастрычніка было загатоўлена 100 тон, дык за першую палову лістапада — 50 тон.

Дрэнна і з захаваннем прынятага сыру. Навені, гэта хаваецца траста, не маюць сценак. Снег так і падае проста на трасту.

Да гэтага треба дадаць, што замест наяўных на заводзе двух турбін працуе толькі адна. У рэзультаце замест 15 цэнтнераў ільнавалакна кожны дзень апрацоўваецца толькі 5,5 — 6 цэнтн. Справа ў тым, што ні заводскія, ні раённыя арганізацыі не паклапаціліся забяспечыць завод неабходнай сілавой устаноўкай, нават не падумалі аб замене прагарэўшых труб ад лакамабіля.

Зусім слаба кіруюць заводам і раённыя арганізацыі (РК КП(б)Б, РВК, райпрафсавет і загатлён), якія адгарадзіліся ад завода «кітайскай сцяной»

Брыгада «ЗВЯЗДЫ» і «КАЛГАСНАЙ ПРАУДЫ»: ЗАРУБЕЖНЫ, ДОКТАРАЎ, СЯМЁНАЎ, ДЗЕНІСЕВІЧ.

ШВІНГТУРБІНЫ БЕЗ НАГРУЗКІ

Каралеўскі ільназавод (Лёзненшчына) пабудаваны у гэтым годзе. Новы будынак стаіць на высокім месцы ля пашы і вабіць вока.

Дрэнна ідуць загатоўкі трасты ў раёне дзейнасці каралеўскага ільназавода. Загатоўлена ўсяго 18 проц. гадавой патрэбнасці. Гадавы план — 5.500 цэнтнераў. Якасць загатоўленай трасты пездавальняючая. Паводле плана треба загатовіць турбінай трасты (ад нумара 1,5 і вышэй) 75 проц., а кудзельнай трасты (не ніжэй першага нумара) — 25 проц.

Каралеўскі сельсавет павінен даць свайму заводу трасту не ніжэй нумара 1,5. Так запісана і ў кантрактацыйных дагаварах. А што ён дае?

Да 13 лістапада на завод здана 52,38 тоны трасты, у тым ліку турбінай — 2,92 тоны і кудзельнай— 49,46 тоны. У процантах: турбінай — 5,5 проц., кудзельнай — 94,5 проц. Каранцей кажучы, на завод на ступае траста сусім нізкай якасці. А нізкая якасць таму, што лён не сартаваны або дрэнна сартаваны. У калгасах ёсць траста і лепшай якасці (турбінная), але яе прытрымліваюць для ручной перапрацоўкі.

Гэта кулацкая тактыка не разбіта. Канкрэтныя не посьбіты не пакараны.

Галоўнае—гэта арганізацыя сартавання трасты, навучыць калгаснікаў, як гэта треба рабіць паводле адпаведных стандартаў.

Што-ж робіць завод? Дырэкцыя чакае шкоднік калгаснікі самі прывязуць добрую трасту. Стандарты-ж лежаць на заводзе, акуратна заламаваныя ў ратожку. Ніжай арганізуючай растлумачальнай работы ў калгасах завод не вядзе.

У Каралеўскім сельсавеце працуе ўпаўнаважаны РК КП(б)Б тав. Пастушонак. Ён і старшыня сельсавета тав. Нікалаенка толькі тое і робяць, што склікаюць пленумы і нарады.

Ільназавод не маючы турбіннай трасты, зрывае праграмы як па колькасці, так і па якасці. Паводле задання ў кастрычніку завод павінен быў даць 35 цэнт. доўгага валакна і 93 цнт. кароткага. Фактычна — за паўтара месяца завод даў 12 цэнт. доўгага валакна і 77,24 цэнт. кароткага. Два цэхі на заводзе — швінгтурбінны і кудзельны. Траста-ж загатоўлена у большасці кудзельная — нумар 1 і 1,25. Для швінгтурбіны няма сырца.

Што-ж робяць дырэкцыя завода На швінгтурбіну яна пускае кудзельную трасту. І вось замест 8 проц. доўгага валакна з трасты 1,25 нумара выходзіць 2,5 проц. доўгага валакна, рошта — турбінныя адыходы, нізкаякасная прадукцыя. Мы груба падлічылі эканамічныя выгікі гэтай маніпуляцыі. З адпускаваў колькасці (100 кгр.) трасты № 1,25 прапушчанай праз швінгтурбіну выходзіць 4 кгр. доўгага валакна № 10, гэта па суму 2 руб. 40 к. і 30 кгр. турбіннага адыхода 4-га гатунка, гэта 9 р. 60 к., а разам на 12 руб. Калі-ж гэту трасту зрабіць на кудзелю, то выходзіць 34 кгр. кудзелі № 6 на 48 кап. кілаграм, або на 16 р. 32 к.

Значыць, няма ніякага сэнсу кудзельную трасту пускаць праз швінгтурбіну, атрымліваючы вельмі нізкі процант выхада доўгага валакна, прычым асноўная маса льняной прадукцыі ідзе ў малакаштоўныя турбінныя адыходы. Апрача таго на швінгтурбіне нерацыянальна працуе 9 чалавек. Гэта дадатковыя накладныя выдаткі на кожны кілаграм прадукцыі.

Ці ведома гэта раённым арганізацыям, Белільнатрактарцэнтру? Ведома. Але яны маўчаць.

Пакінуць швінгтурбіны без патрэбнага сырца або пускаць праз іх кудзельную трасту — гэта злачынства, за якое павінны адказаць ільназаводы, Загатлёт, сістема Ільнатрактарцэнтра і раённыя арганізацыі.

МІКУЦКІ.

Твар ваеннага міністра

«Японія сёння перажывае вялізарнейшы крызіс. Японія сёння стала падобна на маленькае судно, якое змагаецца з хвалямі ў бурным акіяне. Па моры бура, а маленькае судно прадастаўлена толькі літасці разʼюшаных хваль.

Японія сёння падобна да маленькага судна, якое прабівае сабе шлях у барацьбе з варожай стыхіяй.

Японія сёння сірод бязброжнага акіяна, і суша павінна быць дасягнута любой цаной. Тут ні к чаму пытанне—хто капітан, хто афіцэры, хто матросы і пасажыры. Бясспрэчна адно: дапамога павінна быць аказана ўсімі».

Аўтар гэтых лірычных радкоў, амаль верша ў прозе,—ніхто іншы, як цяперашні ваенны міністр Японіі генерал-лейтэнант Садао Араакі. Прыведзеная намі паэтычная характарыстыка сучаснага стана Японіі—цытата з аўтабіяграфіі Араакі, апублікаванай у японскім журнале «Цюо-Карон».

За два гады свайго прабывання ля ўлады Араакі стаў цэнтральнай фігурай японскай унутранай і знешняй палітыкі. Яшчэ два гады назад невядомы начальнік дывізіі, сёння ён—глава ваенна-фашысцкіх груповак, амаль дыктатар ва ўсіх пытаннях, якія датычаць арміі і адзін з магчымых кандыдатаў у прэмʼеры.

Па свайму мінуламу Араакі далёк ад прыдворных колаў. Нешляхетнае паходжанне, аднак, не перашкодзіла яму зрабіць кар'еру, якая лічыцца выключнай нават у Японіі, дзе кар'ера многіх палітычных дзеячоў далёка не воблачна.

У перыяд бясспрэчнай барацьбы Японіі з Англіяй, Германіяй і царскай Расіяй за права поўнасцю выкарыстаць результаты разгрома Кітая ў часе японска-кітайскай вайны 1894-95 р.г., самурайскае сэрца юнага Араакі (як піша яго біограф у журнале «Сучасная Японія») было глыбока засмучана.

Перад руска-японскай вайной малады генштабіст Араакі ўзмоцнена вывучае Расію ў часе камандыроўкі ў Пецярбург. Знаёмства з рускімі падмацоўваецца затым на палях Манчжурыі ў дні руска-японскай вайны і яшчэ раз у Петраградзе ў дні імперыялістычнай вайны. Тут Араакі — адзін з выдатных прадстаўнікоў японскай ваеннай місіі.

Ад начальніка жандармерыі і дырэктара ваеннага вучылішча да камандзіра армейскай дывізіі—роўнамер на ішла нічым не выдатная кар'ера сярэдняга японскага генерала. Так было да канца 1931 г., калі паў габінет Вакацукі. Пасля звычайнай барацьбы за ўладу паміж асноўнымі буржуазнымі партыямі Японіі—Сейюкай і Мінсейто—ца ўлады прыходзіць новы міністр, прастарэлы Інукаі. І нечакана на пост ваеннага міністра вылучаецца кандыдатура нікому невядомага генерала Араакі. Тут, як яны чайна, былі прывезены ў рух спружыны таго скрытага механізма, які кіруе палітычным жыццём сучаснай Японіі.

***

Японія на раздарожжы. «Блескучыя перамогі» японскай арміі над арміяй Чжан Сюэ-ляна, бамбардыроўка манчжурскіх гарадоў і вёсак, разгароўнышся апетыты японскага імперыялізма трывожаць другіх імперыялістычных драпежнікаў. Ліга нацый хвалюецца і шле камісію Літона для вывучэння становішча ў Манчжурыі. Габінет міністраў Японіі перажывае трывожныя часы. І ў гэтыя дні Араакі дабіваецца ад габінета цвёрдага рашэння любой цаной завяршыць па чатую акупацыю Манчжурыі. У Манчжурыю накіроўваюцца новыя дывізіі, а армія Чжан Сюэ-ляна адыходзіць за вялікую кітайскую сцяну.

Гэта першая «перамога» ваеннага міністра была пачаткам яго бліскучай кар'еры. На чарзе прызнанне Манчжурыі Японіяй. Па настаянню ваеннага міністра прызнанне Манчжурыі «незалежнай дзяржавай» абмяркоўваецца толькі за два тыдні да прыбыцця дакладчыка камісіі Літона ў Жэневу.

На чарзе яшчэ адно выпрабаванне —шанхайскія баі. Рабочыя атрады і 19-я кантонская армія ўпарта абараняюць Шанхай. Вуліцы Чапея ператвораны ў попел і заліты крывёю. Японскія бамбардыроўшчыкі і танкі раўнаюць з зямлёй кітайскія кварталы горада, стараючыся толькі не закрануць вуліц сетльмента і французкай канцэсіі, ахоўваемых амерыканскай морской пяхотай і валанцёрамі з мясцовай чужаземнай моладзі.

Аг'янёныя поспехамі японскай арміі ў Манчжурыі і Паўночным Кітаі шматлікія фашысцкія групоўкі Японіі незадаволены «марудлівай і нерашучай палітыкай» кіруючай партыі і не габінета. Ім патрэбна кроў, каб хутчэй ажыццявіць задачы, намечаныя ў вядомым плане генерала Танака. І вось чатыры месяцы, з лютага па май 1932 года, японскія фашысты робяць тры буйнейшыя палітычныя забойствы: міністра фінансаў Іноуэ, главы самага буйнага ў Японіі капіталістычнага канцэрна Мішуі-барона Данэ і, нарэшце, прэмʼера Інукаі.

Палітычныя змовы, арганізуемыя фашысцкімі групоўкамі, — з'явішча звычайнае для Японіі апошняга дзесяцігоддзя. Нарэдкі і тэрарыстычныя акты, ахвярамі якіх з'яўляліся выдатныя палітычныя дзеячы. Але практыка японскага фашызма не ведала да гэтага часу палітычных забойстваў, зробленых ваеннымі, якія знаходзяцца на сапраўднай ваеннай службе.

Падзеі 15 мая робяць вялізарнае ўражанне ў Японіі, хоць на працягу некалькіх месяцаў панае жорсткая забарона на ўсе паведамленні аб правезенай спробе фашысцкага перавароту. Забітага прэмʼера замяняе цяперашні кіраўнік японскага габінета Саіто.

Па традыцыі, існуючай у Японіі, Араакі, маральна адказны перад імператарам за ўдзел ваенных у змове, падае ў адстаўку. Кандыдатура яго нагадзіка на пост ваеннага міністра генерала Мінамі адхілена; непрыемлемай аказалася і кандыдатура японскага генерала-губарнатара ў Карэі Угакі. Араакі зноў ля ўлады. Араакі не асуджае «ваенную моладзь», забыўшую ў сваім патрыятычным запале аб установах «кодэкса японскай маралі», дзе пакорлівасць свайму гаспадару лічыцца вялізарнай дабрачыннасцю. Удзельнікаў змовы аддаюць пад суд ваеннага трыбунала. Загадамі па арміі Араакі спрабуе адпавіць дысцыпліну, парушаную ўдзелам ваенных у забойстве прэмʼера. Адначасова, з самага пачатку манчжурскай аперацыі, у арміі ідзе безупынае палявание на ўсіх «заізраэлемых у «небяспечных мыслях». Тысячы салдат варочаюцца з японскіх часцей, размешчаных у Манчжурыі і Кітаі, назад у Японію і аддаюцца пад суд ваеннага трыбунала. Жалезная палка ваеннай жандармерыі, кіруючая вопытнай рукой, арудуе на ўсю.

У вачах японскай буржуазіі аўтарытэт генерала Араакі поўнасцю адноўлен.

За спіной ваеннага міністра стаіць паважаючае яго фашызаванае афіцэрства і цвёсткі фашысцкіх арганізацый розпага толка, гатовых на любыя дзеянні для «ўмацавання» аўтарытэта краіны ўзыходзячага сонца. Для іх цяперашні ваенны міністр — ідэйны кіраўнік, практычна вучучы Японію на шляху, вызначанаму планам генерала Танака.

Адновіўшыся ад традыцыйнай у Японіі барацьбы паміж марскім і ваенным вядамствам, адбіваючай дзве процілеглых лініі японскай знешняй палітыкі з яе экспансіяй на сушы і на моры, Араакі з выключнай упартасцю дабіваецца вялізарных асігнаванняў на армію, складаючых 37 проц. усяго бюджэта, не лічачы асігнаванняў на флот.

***

Не гледзячы на сунакойваючае паведамленне прэмʼера Саіто аб знойдзеным кампромісе паміж членамі рады міністраў, крызіс габінета не зжыт. Гэты крызіс у цяперашніх умовах—проста шлях да новага ўзвышэння Араакі. Узначаленне ім новага габінета можна лічыць найбольш магчымым, а гэта проста шлях да дыктатуры ваенна-фашысцкіх груповак.

Над Японіяй, як ніколі за апошнія дзесяцігоддзі яе палітычнага жыцця, нависла пагроза новага, яшчэ больш пышнага росквіта ёмных сіл рэакцыі.

Куды прывядуць гэтыя сілы, куды пацыкне гэта «маленькае суднаўка сярод бурнага акіяна», як характарызуе сучасную Японію Араакі,—пакажа недалёкае будучае. Японскія імперыялісты рыхтуюць новыя войны, новыя правакацыі, лёза якіх накіравана супроць СССР.

К. РАДЭК

Амерыка „адкрывае" СССР

(НЕКАЛЬКІ ЎСПАМІНАЎ І МЫСЛЯЙ)

Гэта было ў лютым 1918 года, калі совецкая дэлегацыя ў Брэст-Літоўску адмаўлялася падпісаць мір і немцы адказалі на гэта адмаўленне наступленнем, Смольны гудзеў, як пчаліны вулей. Прыходзілі і выходзілі ваенныя, прыходзілі і выходзілі прадстаўнікі заводаў. Краіна рыхтавалася да абароны.

Я сядзеў у пакоі аддзела знешніх адносін, калі да мяне ўвайшоў палкоўнік Робінс, начальнік місіі Чырвонага крыжа ПАЗШ у суправаджэнні свайго перакладчыка Гомберга. Ён прапанаваў неадкладна адправіць на Нарэскі і Пскоўскі фронты санітарныя пункты амерыканскага Чырвонага крыжа.

Я ведаў палкоўніка Робінса з пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэта была цікавейшая асоба. Былы рудакоп, знайшоўшы золата і стаўшы багатым чалавекам, Робінс не страціў сімпатый да народных мас. Найлепш дэмакрат, гаварыўшы са шчырай шчырасцю аб імперыялізме, Робінс, аднак, ненавідзеў толькі германскі імперыялізм.

Робінс расказваў, як, прыехаўшы ў Расію, ён гатовы ён выратаванне ў эсэрах, падтрымліваў сувязь з Савінкавым, якога лічыў амаль што народным героем. Ён расказваў, як потым разуверыўся ў здольнасці эсэраў весці вайну або заключыць мір і ўзначаліць народныя масы ў барацьбе за паляпшэнне іх жыцця. Робінс надзяляў, што ён не камуніст і не верыць у комунізм, але што, на яго перакананню, совецкая ўлада стане формай, у якой знойдуць найбольш поўнае выяўленне дэмакратычныя імкненні шырокіх народных мас. Што-ж датычыць народнай гаспадаркі, то,—гаварыў Робінс,—яна напэўна прыме форму капэрацыі.

Мне прыходзілася і пазней часта сустракацца з палкоўнікам Робінсам, пры сутнічаць пры яго гутарцы з Леніным. Ён быў гарачым застрэльшчыкам прызнання совецкай улады саюзнікамі і ў першую чаргу Амерыкай. Знаходзячыся ў ітымных зносінах з Вільсонам і карыстаючыся правам шыфра, ён змагаўся за прызнанне совецкай улады і пасля таго, як мы заключылі мір з Германіяй.

Робінс глыбока верыў у вялікую будучыню рускага народа. Ён падарыў мне маленькую амерыканскую карту, на якой нанесена была Азіяцкая і Эўрапейская Расія і, указваючы на ўсталёную Эўропу, выглядаўшую на Расіі зверху, як маленькі горб на вялізарным эўразійскім кантыненце, часта паўтараў:

«Вы будзеце самай вялікай нацыяй у свеце».

1 мая 1918 г. мы з Робінсам прыехалі на першы вайсковы парад на Хадынцы. Парад быў маленькім і нізкарадным, але Робінс бачыў у ім параджэнне сілы Совецкай рэспублікі.

Хутка Робінс паехаў у Амерыку. Гэта было перад самым пачаткам паўстання чэха-словакаў. Ужо паўзлі правакацыйныя чуткі аб захвале Сібіркай чытучкі нямецкімі наёмнапалоннымі. Робінс адразу зразумеў, што створаецца легенда, якая павінна падрыхтаваць інтэрвенцыю.

У 1919 г., седзячы ў германскай турме, я з вялікай радасцю чытаў у амерыканскіх газетах аб той барацьбе, якую вядзе Робінс супроць інтэрвенцыі, аб яго мужных выступленнях у камісіі сената, у якой у адказ на спробы дыскрэдытацыі большэвікоў, ён адказаў, што будзь ён рускім, ён-бы неміну́ча быў большэвіком. Калі, вярнуўшыся з Германіі, я прывёз Леніну кнігу, з дакумэнтамі аб барацьбе Робінса супроць інтэрвенцыі, ён сказаў:

«Вось малайчына! Хто-б гэтага чакаў ад амерыканскага буржуа».

***

1919 год. У Парыжы засядае версальская канферэнцыя. За яе кулісамі тры чалавекі—Лойд-Джордж, Вільсон і Клемансо—бяруць на сябе вызначэнне лёса чалавецтва. Яны выпрацоўваюць план вырашэння цэнтральна-эўрапейскіх пытанняў; яны бяруць на сябе «клопаты» аб лёсе Расіі; яны дыктуюць законы развіцця Азіі.

Стары «тыгр» Клемансо ведае ад усіх хвароб света толькі адно лякарства — жалеза. Ён хоча ім лячыць Германію, ён хоча ім лячыць большэвізм. Лойд-Джордж сумняваецца ў выратавальных якасцях жалеза. Вільсон мітусіцца ў сценах сваіх абстрактных пацыфісцка-дэмакратычных ідэй.

Ён бачыць безнадзейнасць інтэрвенцыі. У штабе яго дарадцаў знаходзіцца адвакат і журналіст Вільям Булліт. Яго Вільсон пасылае праз Фінляндыю ў Расію для перагаворэў з совецкімі урадам наконт магчымасці кампраміса.

Булліт вяртаецца з дакладам, у якім указвае і на сілу Совецкага Саюза і на яго гатоўнасць ісці на далёка ідучыя ўступкі, каб уніхнуць інтэрвенцыі.

Але ўжо было прынята рашэнне наступаць на Совецкую рэспубліку. Лойд-Джордж у публічнай прамове заяўляе, што яму нічога невядома аб місіі Булліта. Вільсон маўчыць. Версальская канферэнцыя дыктуе сваю волю Германіі. Інтэрвенцыя пачынаецца. Вільям Булліт падае ў адстаўку і матывуе яе ў патрасаючым лісце да Вільсона (ад 17 мая 1919 г.), у якім піша:

«Я быў адным з тых сярод мільёнаў, якія шчыра давяраліся вашаму ўзвышэнству, верачы, што вы не забяспечыце нічога іншага, чым пастаянны мір, які апіраецца на боскарыслівую справядлівасць. Але вам урад згадзіўся падвергнуць пакутуючыя народы света новым патрасеньням, новым падзелам, пачаць новыя войны, і я не магу перакланяць сябе, што магчыма якая-б там ні было работа над створэннем новага света ў якасці служачага гэтага ўрада».

Булліт папракае Вільсона ў тым, што з Расіяй нават не пажадалі гутарыць. Ён прыводзіць усе рашэнні версальскай канферэнцыі, якія, паводле яго глыбокага пераканання, прыводзяць у будучым да новых жудасных войнаў. Ён піша: «Я ведаю, што вы асабіста былі супроць гэтых рашэнняў і што вы іх прынялі толькі пад нажыскам. Але, не гледзячы на гэта, я пераконан, што калі-б вы адважыліся адкрыта змагаці на, замест таго, каб дзейнічаць за зачы нёнымі дзвярыма, вы пацягнулі-б за сабой грамадскую думку ўсяго света, якая падтрымала-б вас. Я пакадую аб тым, што вы не змагаліся да канца і што вы мелі так мала веры ў тыя міль ёны людзей усіх нацый, якія таксама, як я, верылі ў вас».

Булліт не разумеў таго, што добра разумеў палкоўнік Хауз, галоўны дарадца Вільсона, запісаўшы ў сваім дзённіку, што, апіраючыся на народныя масы, можна было-б, зразумела, дабіцца іншых результатаў, але калі-б народныя масы паўсталі, то яны зламалі-б не толькі існуючыя ўрады, але яшчэ нешта большае. Палкоўнік Хауз закончыў свае запісы выразнымі той мыслі, што Амерыка не для таго пасылала сваю дэлегацыю ў Эўропу, каб наладжваць суповетную рэволюцыю...

Версальскі мір быў усталёўлен, войскі інтэрвентаў разбуралі Расію, неслі смерць, галечу і хваробы мільёнам.

***

Совецкі Саюз разбіў войскі інтэрвентаў, адстояў уладу рабочага класа, прымусіў адну дзяржаву за другой уступіць з сабой у дыпламатычныя адносіны. Толькі ПАЗШ заставаліся на пазіцыі «непрызнання» совецкай улады. Як правільна сказала ў зборніку матэрыялаў, прысвечаным адносінам Злучаных Штатаў да Совецкага Саюза, выданым у лістападзе 1933 г. камітэтам руска-амерыканскіх адносін інстытута Амерыкен фаундэйшэн, Амерыка глядзела на СССР як на «часовае варварства».

Амерыканскі міністр замежных справ Кольбі заявіў 10 жніўня 1920 г., што совецкі ўрад «апіраецца на адмаўлен не ўсякага прынцыпа гонару і добрай веры, на адмаўленне ўсякіх звычаяў і форм, на якія апіраецца структура міжнароднага права, каралей гаворачы, на адмаўленне ўсякага прынцыпа, без якога немагчымы даверальныя гармавічныя адносіны паміж нацыямі і індывідуумамі». Заява каталася цвёрдым указаннем, што Амерыка не можа прызнаць СССР.

У адказ на заяву тав. Калініна ад 21 сакавіка 1921 г., пераданую тав. Літвінавым, які займаў тады пост паўпрэда СССР у Эстоніі,—адзіны дыпламатычны пост, які ў нас існаваў у тыя гады за граніцамі СССР,—Гувер, тагачасны міністр гандля ПАЗШ, заявіў, што пакуль Совецкі Саюз не адмовіцца ад сваёй сістэмы, не можа быць і гутаркі аб аднаўленні адносін.

Міністр замежных спраў Амерыкі Юз у лісце да Гомперса заявіў у сакавіку 1921 г., што Совецкі Саюз—«гігантская пустыня». Гаворачы аб эканамічным падтрымаці Расіі, ён заявіў: «Нельга падтрымліваць тое, чаго няма». У лісце да таго-ж Гомперса ад 19 ліпеня 1923 г. Юз, сёдзячы з самых буйных амерыканскіх адвакатаў, займаўшых калі-небудзь пост міністра замежных спраў Амерыкі, гаварыў, што «Расія вярнулася да поўнага сярэдневякоўя».

Яшчэ 14 красавіка 1928 г. міністр замежных спраў ПАЗШ Келог заявіў, што пакуль совецкі ўрад не адмовіцца ад усіх смяротных пратрашэнняў супроць «цывілізацыі», не можа быць і гутаркі аб яго прызнаньні.

П-н Гувер не лічыў неабходным у якасці амерыканскага прэзідэнта хоць адзін раз выказаць сваю думку аб адносінах да СССР. Калі палкоўнік Кутпер, адзін з амерыканскіх інжынераў, дапамагаўшых нам сваімі ведамі ў пабудове Днепрадэса, з'явіўся да Гувера, каб далажыць яму аб тым, што ён бачыў у СССР, Гувер заляў яму толькі адно пытанне: «А што, яны вам плацілі пэнсію акуратна?»

***

Летам 1932 г. Вільям Булліт, які адышоў ад палітычных спраў пасля краха эпохі Вільсона, прыехаў у СССР, каб паглядзець уласнымі вачыма на развіццё нашай краіны. Мы ўспомнілі а ім аб тым, што Лінкольн Стэфанс, буйны амерыканскі пісьменнік, суправаджаўны яго ў 1919 г. у часе паездкі ў Маскву, паведаўшы мяне, едучы назад, у германскай турме, на маё пытанне, што-ж ён бачыў, адказаў: «Тое, што бачылі мае вочы, было вельмі дрэнна. Тое, што бачыла мая душа—вельмі добра». Лінкольн Стэфанс бачыць у 1919 г. тое, што імперыялістычная вайна і інтэрвенцыя зрабілі з Расіі—голад, тыф: ён убачыў краіну, залітую крывёю. Але гэты чесны і ўдумлівы чалавек бачыў, што мы змагаемся за новы лад і, не будучы комуністам, разумеў, што ў гэтых баях вырашаецца лёс чалавецтва.

Смяючыся, я запытаў Булліта: «Ну, што-ж, вашы вочы цяпер таксама не бачаць нічога добрага?»

Булліт адказаў мне.

— Ва ўсім свеце ідзе развал. Вы — адзіная краіна, якая мужна маршыруе наперад.

Ён выказаў глыбокае перакананне, што прызнанне СССР Амерыкай немінучча.

— Самыя шырокія колы амерыканскай грамадскасці ведаюць,—гаварыў Булліт, — што тут ідзе вялікая будоўля. Яны ведаюць, што вас ужо разбіць нельга, што вас выкрасліць з гісторыі нельга, і гэты факт не можа не зламаць супраціўлення найбольш тупых і карыслівых элементаў у ПАЗШ.

Ён з вялікай цікавасцю гаварыў аб Рузвельце, які тады яшчэ не быў прэзідэнтам, прадстаўляючы яго як чалавека вялікай мужнасці і настойлівасці, не прыхыльнага заплюшчаць вочы перад фактамі. «Рузвельт будзе выбран, і ён

Усебеларускі вытворчы паход імя тав. Гікало

ВОСЕМ І АДЗІН

На працягу першай пяцігодкі і другога года другой пяцігодкі запалкавая прамысловасць асвойвала новай перадавой тэхнікай. Прадпрыемствы поўнасцю механізаваны. Ручную набіўку салонкі замянілі складанейшымі аўтаматамі замежнай і совецкай вытворчасці. Набіўныя машыны, этыкетныя апараты, сушыльныя шафы, строгальныя станкі і, нарэшце, строга разлічанае палатно канвеера — вось груда механізмаў, якімі багаты запалкавыя фабрыкі.

Каму даверана гэта абсталяванне?

Гэтае пытанне ўзнікае кожны раз, калі мы сустракаемся з фактамі бязлітаснай, барбарскай ломкі, неахайных адносін да аўтаматаў, калі справа ідзе аб падбораўчасным рамонце.

Часамі складанейшае абсталяванне трапляе ў рукі людзей, якія нічога не ведаюць аб рабоце машын. І калі-б машыны на запалкавай фабрыцы «Пролетарская перамога» мелі-б здольнасць гаварыць, дык яны расказалі-б аб масавых прастоях, аб частых гарэннях, аб безупынных дробных аварыях і паломках.

І... была-б гэтая аповесць аб людзях, якім не толькі нельга даверяць машыну, але і на сярэту падпускаць да механізмаў...

Хто яны?

Гэта тыя, для каго інтарэсы вытворчасці — пусты гук, для каго соцыялістычная фабрыка — чужы праезджы дом. З гэтымі людзьмі на прадпрыемстве доўга пазмагаліся. Перагружаныя механікі і мацёры заміталі сляды іх злачынства бесперапынным лячэннем і вельмі часта нельгожым.

«Пролетарская перамога» зараз такіх людзей амаль не мае.

Але ёсць людзі, якія шкодзяць механізмам па сваёй тэхнічнай слепаце. Мы маем на ўвазе вялікую масу новых рабочых, якія яшчэ не аўладалі тэхнікай абсталявання. Неасцярожны, наўмелы паварот ля варштата — і машына зламана. Спалоханая работніца ўсхвалявана бегае па доху ў пошуках мацёра. Мацёра цяжка знайсці. Настойлівая работніца яго знайшла, — ён заняты ля варштата другой работніцы, і такой-жа «нечаслівіцы», як і гэта. Прастой зацягваецца. Нарэшце, работніца вядзе мацёра да сябе. Ён падкруціць гайку, адрэгулюе клей — гатова! Дробязны рамонт! А колькі часу страчана!

Тэхнічная непісьменнасць рабочых дае новыя прастоі, б'е па клану. З 2.900 гадзін прастояў, зарэгістраваных па фабрыцы «Пролетарская перамога» за 9 месяцаў гэтага года, большую частку можна аднесці за лік тэхнічна-непісьменнага рабочага і работніцы.

«Пролетарская перамога» дорага расплачвалася за тэхнічную непісьменнасць рабочых.

З вялікім спазненнем, пасля чысткі партыйнай арганізацыі, на запалкавай фабрыцы ўзяліся за аўладанне тэхнікай. Прайшло не больш 1½ месяца і выйшлі настолькі адчувальныя, што змаглі прыпаць адзіўць кіраўнікоў прадпрыемства, партыйную, комсамольскую, прафесіянальную арганізацыі.

Пачалі комсамольцы.

Да Строгіна — мацёра каробачнага цэха, з'явілася група моладзі і комсамольцаў — брыгада Марозавай і патрабавала:

— Вучы нас! Хочам ведаць варштат!

Разлік быў правільны. Строгін — лепшы мацёр-ударнік і ён не мог адмовіць. Быў заключан дагавор, складзена праграма.

Строгін і 8 комсамольцаў штодзённа пасля работы аўружалі машыну, капаючыся ў не замыславатых вантробах. Гэта была першая васмёрка, якая дружна ўзялася за справу. У Строгіна «высмоктвалі» ўсё, што толькі можна было «высмактаць» у гэтую гадзіну...

Так першыя восем комсамольцаў пачалі барацьбу за асваенне тэхнікі.

Рэзультаты праявіліся амаль адразу. План брыгада сачала выконваць на 105 проц. Два з васмёркі: Зускін і Казлоўская замест нормы 5½ круга даюць ужо 6 і больш. Брак зменшыўся ў 3 разы. Замест дапушчанага цэлапам кіло брака, уся брыгада дае толькі паўкіло.

Строгін і 8 комсамольцаў сталі папулярны на фабрыцы. Лепшыя майстры самі пачалі навучаць моладзь. Майстар Шпак навучае 7 этыкеровшчыц. Майстар Соскін навучае 5 машыністкаў. Мацёр Ржавуцкі — 7, мацёр Жукоўскі — 2. Майстар Вайткевіч — 2. Лепшая работніца Плохава навучае работніцу Каспюкевіч. Мацёр Есіновец навучае 2 комсамольцаў.

Ужо няма на фабрыцы такога цэха, у якім моладзь не займалася-б вывучэннем тэхнікі.

Першы грамадскі тэхнічны экзамен ператварыўся ў важную падзею на фабрыцы. Першы тэхэкзамен здавала васмёрка Марозавай — выхавальнікі Строгіна. І вось вынікі: Марозава В., Марозава С., Васілёўская і Конапава здалі экзамен на «вельмі добра». Каган і Каждан па «здавальняюча», а Казлоўская па — «добра».

Брыгада строгаля Лібермана з 5 чалавек поўнасцю здала па «вельмі добра».

У першыя дні колькасць здаўшых тэхэкзамен дасягнула 32 чал. Да гэтай колькасці штодзённа прырастае яшчэ 15-20 чалавек. У хуткім часе па «Пролетарскай перамозе» створыцца добрая база для сур'ёзнай работы па здачы норм на значок «ЗОТ». Грамадска-тэхнічны экзамен па меркаванню прадпрыемства павінен паслужыць толькі падрыхтоўчай работай для разгорнутай барацьбы за гапаровы значок «ЗОТ», зацверджаны ўрадам.

У кватэрме вытворчага пахода імя т. Гікало сярод раду абавязацельстваў, прынятых фабрыкай, ёсць пункт аб здачы норм на значок «ЗОТ» (50 проц. усіх рабочых у першым квартале 1934 года, а да першага студзеня 1934 года 80 процантаў рабочых павінны здаць тэхнічны экзамен). Абавязацельства сур'ёзнае.

Для таго, каб быць гаспадаром свайго слова, кіраўніцтва фабрыкі павінна яшчэ шмат чаго зрабіць. Вялікае небяспеку той факт, што некаторыя майстры і мацёры закінулі тэхвучобу. Нарэшце ад стыхійнай тэхвучобы трэба перайсці да арганізаванай, плаванай работы па аўладанню тэхнікай. Апрача таго, праграма гурткоў распрацавана слаба. Амаль усе праграмы падстрыжаны пад «адну грабёнку», без улікі тэхнадрыхтоўкі рабочага, работніцы.

Выправіўшы гэтыя недахопы, «Пролетарская перамога» пры тым вялікім ліку інжынерна-тэхнічных работнікаў, якія ёсць на ф-цы, можа цалкам выканаць тэтую задачу.

Б. Р.

Лепельскае кіраўніцтва пусціла на самацёк пастаўкі збожжа аднаасобнікамі

ПЕРАМАГЧЫ ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫЯ НАСТРОІ, МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАННЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ — БАЯВАЯ ЗАДАЧА УСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ АДСТАЮЧЫХ РАЁНАЎ

Факты абвінавачваюць

ЛЕПЕЛЬ. Адным з самых адсталых раёнаў у збожжапастаўках з'яўляецца Лепельскі. Да 15 лістапада раён выканаў толькі 83,4 проц. плана. Запазычанасць дзяржаве дасягае 500 тон. Апошняя пяцідзёўка дала зусім нікчэмны зрух — паступіла толькі 29 тон, або адзін процант плана.

Натураплаты паступіла 63,6 проц. задання.

За апошнія тыдні раённыя арганізацыі дэмабілізаваліся, згарнулі ўсякую работу па пастаўках.

Вельмі дрэннае становішча па аднаасобным сектары. Тут даюць сябе адчуваць плады самацёка і адсутнасці масавай работы.

Аднаасобнікі **Стайскага** сельсовета выканалі план збожжапаставак толькі на 35 проц. Раённае кіраўніцтва не скарыстала закона аб двёрных пастаўках для перамагання кулацкага сабатажа. Паўтараецца гісторыя мінулага года, калі ліквідыраваныя адносіны да сабатажнікаў прывялі да недапушчальнага зацягвання кампаніі, да разбалярвання збожжа.

У вёсцы **Юркава Сцяна** рад аднаасобнікаў яшчэ не здалі ні аднаго кілаграма. Кулацкія, гаспадаркі, карыстаючыся адсутнасцю класавай пільнасці, пасцелі схаваць і разбазарыць збожжа. Ні адзін з сабатажнікаў да адказнасці не прыцягнут. Кіраўнікі сельсовета не бачаць сабатажа, а раённае кіраўніцтва не ведае, што робіцца на месцах.

Каменскі сельсовет атрымаў раённы пераходны чырвоны сцяг за «поспехі» ў правядзенні сельгаскампаній. Узнагароджанне гэтага сельсовета сведчыць, што РК і РВК не ведаюць сапраўднага становішча на месцах і штампуюць ашуканчыя зводкі. План збожжапаставак выканан аднаасобнікамі гэтага сельсовета толькі на 35 проц. 37 аднаасобных гаспадарак не выканалі сваіх абавязацельстваў. Есць рад гаспадарак, якія яшчэ не пачыналі здачы прадукцыі. Вялікая запазычанасць па збожжу лічыцца за калгаснікамі. Калгаснікі с.-г. арцелей «Зорка жыцця», «Полымя», «Комінтэрн» не здалі ні аднаго кіло збожжа ўраджаю прысядзібных участкаў. Раённае кіраўніцтва ліберальнічае са зрыўчыкамі планаў. Характэрна, што лепельская газета «Калгасная праўда» не ставіць нават пытання аб адабранні ў Каменскага сельсовета пераходнага сцяга. Яна толькі напярэдадні сельсовет, што чырвоны сцяг застанецца ў яго пры ўмове, калі будучы выканаены абавязкі перад дзяржавай. Гэта гаворыцца пасля таго, як усе тэрміны здачы збожжа даўно прайшлі!

Зусім слыпіліся пастаўкі збожжа па аднаасобным сектары **Воранскага** сельсовета. Старшыня **СУДАК**, сакратар ячэйкі **ЛІСІЧОНАК**, упаўнаважаны РК **ФІЛЬМАНОВІЧ** закінулі ўсякую арганізацыйную работу і спадзяюцца, што самацёк вывезе. Выдучаны адказныя па дзесяцідворках. Аднак, ніхто не цікавіцца пытаннем, што яны робяць. Кулацкія элементы пад носам сельсовета і прадстаўніка РК і РВК ядуць агітацыю супроць здачы збожжа, ніхто з іх да адказнасці не прыцягнут.

У калгасе «Шосты з'езд советаў» доўгі час арудаваў класавы вораг. Кулацкі лазутчык — рахункавод **КАРНІЛОВІЧ** — на працягу года не запісваў прадукты ў кніжкі калгаснікаў, не выдаваў прадуктовых кніжак. Есць выпадкі, калі лепшым ударнікам запісана толькі па 8 працадзён. Праўленне калгаса на чале з членам партыі **БЕЛЬСКІМ** пад уплывам Карніловіча выключыла з калгаса лепшых ударнікаў, займалася самым агідным адміністраваннем—антрэфавала калгаснікаў на 251 працадзень. Кулацкая практыка Карніловіча і яго паплечнікаў прывяла да зрыва важнейшых сельгаспрацэс, да знішчэння ўраджаю, да вялікіх прарываў у пастаўках збожжа і бульбы.

Гэтыя злачынствы выяўлены толькі ў часе чысткі ячэйкі суседняга ільназавода. Класавы вораг на працягу доўгага часу адкрыта рабіў шкодніцкую справу і разлагаў калгас. Толькі пасля чысткі прэзідыум лепельскай РКК-РСІ прыняў меры ў адносінах да Карніловіча.

Усе гэтыя факты з'яўляюцца сур'ёзным абвінавачаўчым актам лепельскаму раённаму кіраўніцтву. Лепельскі РК (тав. **ХІНЖАНКОЎ**) і РВК (тав. **НАРОЕНКА**) пусцілі справу паставак на самацёк, дэмабілізаваліся на адказнейшым этапе кампаніі. Адсутнасць кіраўніцтва скарысталі класава-варожыя элементы для зрыва выканання плана паставак.

П. Н.

НІ АДНАГО НЕДАВЫКАНАНАГА ПРОЦАНТА!

Звонка камітэта загатовак на 15 лістапада сігналізуе, што многія раёны зусім слыпілі барацьбу за збожжа.

Поспех збожжапаставак гэтага года ўскружыў галаву раду раённых кіраўнікоў — яны не давялі справы да канца, дэмабілізаваліся, не праверылі, як выконваюцца ўручаныя абавязацельствы, не ліквідавалі запазычанасці па ўсіх сектарах.

За сярэднімі лічбамі выканання плана ў многіх раёнах хаваюцца вялікія «хвасты» запазычанасці па збожжы ў паасобных сельсоветах і калгасах.

Звярнуўшы ўсю ўвагу на здачу збожжа калгасамі, некаторыя раённыя арганізацыі закінулі аднаасобны сектар, забыліся аб тым, што выкананне плана аднаасобнікамі патрабуе асаблівага сур'ёзнай арганізацыйна-масавай работы.

На прыкладзе Лепельскага і Полацкага раёнаў можна бачыць, да якіх вынікаў прыводзіць ігнараванне аднаасобнікаў.

Класава-варожыя элементы шырока скарыстоўваюць самацёк у збожжапастаўках для арганізацыі сабатажа здачы збожжа. Гэты сабатаж павінен быць неадкладна зломлены. Мы ні ў якім разе не можам дапусціць рэцыдываў мінулых год. Нельга сушкайшчыца на дасяжнутых поспехах. Нашы дасягненні на фронце барацьбы за збожжа відавочны, але мы не вызваляюць нас ад далейшай упартай работы.

Уручаныя абавязацельствы павінны быць поўнасцю аплочаны. Ні аднаго недавыкананага процанта. Толькі так можа стаяць пытанне.

Вось чаму мы павінны звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на пасіўнае адсталых раёнаў. А іх нямала.

Вось **Горацкі** раён. Ён павінен яшчэ здаць каля 500 тон збожжа. План па натураплаце ён недавыканаў на 30 проц. Вярнулі толькі палову атрыманай насеннязыкі.

Дрэнна працуе і **Заслаўскі** раён. Яго запазычанасць каля 300 тон. За апошнюю пяцідзёўку паступіла па раёну толькі 14 тон. Гэта лічба сведчыць аб поўным спыненні работы па пастаўках. Калі раён будзе так працаваць надалей, ён зацягне здачу збожжа да лютага-сакавіка.

300 тон не здаў яшчэ **Крупскі** раён. Апошняя пяцідзёўка дала па раёну толькі 28 тон. Задание па натураплаце выканана толькі на 60 проц.

Як і раней, ганебна адстае **Чырвонапольскі** раён, кіраўніцтва якога правальвае ўсе важнейшыя кампаніі. За пяцідзёўку паступіла толькі адна тона, у той час, як раён недадаў яшчэ каля 350 тон.

Уручаныя абавязацельствы па здачы прадукцыі дзяржаве не з'яўляюцца простым, нічаму не абавязваючым кавалкам паперы. Яны грунтуюцца на цвёрдым, непахісным дзяржаўным законе. Партыя і ўрад не дазволяць ігнараваць абавязацельствы па здачы збожжа! Перад усімі раённымі арганізацыямі стаіць задача—мабілізаваць усе сілы, каб выканаць заданні па ўсіх сектарах.

ХАЛАСТЫ СТРЭЛ

ПОЛАЦАК. 7 процантаў плана збожжапаставак недавыканаў Полацкі раён. Тольки чатыры сельсоветы, якія разгарнулі баявую работу, дабіліся рашаючых поспехаў. Гэта Ветрынскі, Баярскі, Рушанскі і Астроўнічынскі сельсоветы. Іншыя 29 яшчэ маюць за казычанасць перад дзяржавай. Такія сельсоветы, як Бельскі, Булаўскі, Юравіцкі, выканалі задание толькі на 80-85 проц.

Кулацкі сабатаж ў многіх мясцах не зломлен дагэтуль.

Прыводзім некалькі фактаў.

Самыя адсталыя на Шашпілаўскім сельсовеце — гэта вёскі Касарава і Чотнаручкі. Там сабатаж паставак узначальвае кулак **Цвілінскі Іван**, які ўжо не раз судзіўся за зрыў загатовак. Пад яго ўплывам некаторыя аднаасобнікі зусім адмовіліся выконваць свае абавязацельствы. Меры супроць арганізатара сабатажа не прыняты. 6 кулацкіх гаспадарак не здалі значнай колькасці збожжа і бульбы. Старшыня сельсовета **ЦЕНЦЕРАЎ** літаральна нічога не зробіў, каб перамагчы супраціўленне класава-варожых элементаў.

Такія-ж факты маюць месца па Бельскаму і Булаўскаму сельсоветах.

Райпрафсавет абвясціў сябе мабілізаваным на поўнае выкананне плана, але ён не давёў справы да канца, уся яго дапамога абмежавалася... добрым парывам. Упаўнаважаныя адкліканы з вёскі, іх справаздачы аб праробленай рабоце відзе не абгаворана. Райпрафсавет пашумеў, пашумеў і супакоіўся. Яго работа з'явілася гучным, але халастым стрэлам.

Л. ФРЫД.

ФАРПОСТЫ СССР

Ад Менска да Біра-Біджана 9.400 клм.

Кур'ерскім цягнікам можна з Менска трапіць у Біра-Біджан на дзесятыя сутакі.

І ўсё-ж гэты край, людзі, засяляючыя яго, ударнікі і будаўнікі социялізма з'яўляюцца настолькі нам блізкімі, што адлегласць траціцца.

БССР — шэф Біра-Біджана.

БССР — фарпост социялізма на Захадзе, падае руку брацкай дапамогі працоўным аўрэям, нарэйцам, тунгусам, гольдам, якія пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў будуюць Біра-Біджан — магутны фарпост социялізма на Далёкім Усходзе.

— За дні нашага прабывання ў Менску,—кажуць дэлегаты Біра-Біджана, — мы пераканаліся, што шэфства — не пусты гук. Нашым жыццём, нашай працай і будаўніцтвам жыве цікавіцца уся Совецкая Беларусь, яе кіруючыя органы. Наша праца знаходзіцца пад безупынным кантролем працоўных усяго Совецкага Саюза, і ў першую чаргу БССР, якая клапаціцца арганізоўвае нам брацкую дапамогу.

— Гэта, — кажуць яны, — яшчэ больш надае нам бадзёрасці ў перамаганні тых цяжкасцей і перашкод, якія сустракаюцца нам на шляху социялістычнага будаўніцтва.

А цяжкасцей было нямала. Шмат перашкод прыходзіцца перамагаць, шмат калдобін прыходзіцца эраўняць на шляху будоўлі социялістычнага жыцця там, дзе дагэтуль панавала толькі адвечная тайга і непраходныя балоты, дзе векапомным помнікам засталася вялікая «калясуха», па якой царскі ўрад гнаў на катаргу рэволюцыйных барацьбітоў.

У доўгіх гутарках з рабочымі на прадпрыемствах Менска, у выступленнях на вялікім інтэрнацыянальным вечары ў Доме Культуры, прысвечаным прыезду дэлегацыі, таварышы шмат расказалі аб той вялікай працы, якую правялі працоўныя Біра-Біджана.

—За пяць год будаўніцтва Біра-Біджана, — кажа старшыня дэлегацыі тав. **РАБІНОВІЧ**,—у гэтым раёне засела 7.000 чалавек перасяленцаў—2.500 — у пяці створаных перасяленных калгасах, 1.600 на прадпрыемствах, 600 у саматужных арцелях, 500 у саўгасах і г. д.

Ленінскоўскія вапняныя кар'еры, пам'ёўскі графіт, таежныя дуб і кедр, бірскі вугаль, сутарыйскае золата—пастаў'ены на службу социялізма. Волай дык татары пролетарыята, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры дапамозе пролетарыята СССР працоўныя аўрэі ў інтэрнацыянальным яднанні з усімі народамі, населяючымі гэты край, выкарыстоўваюць яго прыродныя багацці, павялічваюць моц і багацце краіны Совецкай.

— У раёне створаны 92 школы, два тэхнікумы — педагагічны і сельска-гаспадарчы, 2 вячарнія соўпартшколы. Нашы школы абсталяваны не горш цэнтральных. 90 проц. аўрэйскага і мясцовага амурскага насельніцтва — пісьменныя. Ёсць у нас карэйскія школы, ёсць тунгускія.

14 кастрычніка Біра-Біджан наведала дэлегацыя міжнароднага камітэта дапамогі ахвярам фашызма, якая вярталася з антываеннага кангрэса ў Шанхаі. У складзе дэлегацыі быў старшыня міжнароднага камітэта МАРЛЕЙ, член ЦК французскай компартыі ВАЙЯН КУЦЮР'Е, мэр горада Брусселя доктар МАРЛО, член ЦК амерыканскага «Іморэ» ГІНА МЕДЭМ.

Лорд Мерлей, выступіўшы на вялікім мітынгу працоўных Біра-Біджана, пасля свайго азнаямлення з усёй работай, праведзенай у гэтым раёне, сказаў:

«Я хачу тут гаварыць не толькі як член англійскай рабочай партыі, як прыхільнік Совецкага Саюза, але і як прыхільнік аўрэйскага зямлеўпарадкавання. Я знаём з аўрэйскай калянізацыяй у Палестыне, але пасля азнаямлення з вашай працай у Біра-Біджане я пераканаўся, што толькі тут, у Совецкім Саюзе аўрэйскія масы могуць сапраўды ўпадзкавацца і стаць актыўнымі раўнапраўнымі будаўнікамі социялізма».

Выступіўшы пасля лорда Марлея доктар Марло, падкрэсліваючы вялікія дасягненні будаўніцтва Біра-Біджана, сказаў:

— Адзін з перасяленцаў Біра-Біджана сказаў нам:

«Не шукайце тут у нас камфорта. Вы яго не знойдзеце. Але мы не ведаем тут пра беспрацоўе, нам не прыходзіцца не лажыцца аб тым, што мы застанемся без кватэры або без хлеба».

— І вось гэта ўпэўненасць у заўтрашнім дні з'яўляецца сапраўды вашым найвялікшым дасягненнем.

Лорд Мэрлей, доктар Марло маці магчымасць дакладна азнаёміцца з жыццём тых сотень працоўных аўрэяў, якія перасяліліся ў Біра-Біджан з Германіі, Францыі, Аргентыны, Амерыкі, Польшчы і інш. капіталістычных краін. І яны вымушаны былі ў сваіх выступленнях прызнаць тое, што іменна тут у Совецкім Саюзе перасяленцы знайшлі сапраўдны прытулак, што пры брацкай дапамозе працоўных усяго Совецкага Саюза прыехаўшыя з капіталістычных краін актыўна ўключыліся ў будаўніцтва социялізма.

Тав. ЛЕВІНА, перасяленка з Польшчы, у сваім паступленні на заводзе «Комунар» кажа:

— Я працую на перасяленчым пункце, і мне прыходзіцца штодзённа сустракацца з людзьмі розных прафесій, розных социяльных пластоў, а часамі і з такімі людзьмі, якія ніколі не былі на прадукцыйнай працы. І варта паглядзець, як пад уплывам усяго рабочага калектыва, пад уплывам той вялікай работы, якую праводзіць уся партыйная арганізацыя, гэтыя людзі робяцца непасраднымі ўдзельнікамі социялістычнай будоўлі Біра-Біджана. А гэта з'яўляецца надзвычай вялікім фактам, мімо якога ніколі нельга прайсці.

Перасяленец з Германіі тав. БРАНД падробязна расказвае пра фабрыку будаўнічых дэталяў, на якой ён працуе.

— На фабрыцы 9 дзевяцірацоўных машын і дзве вялікія рамы. Летась фабрыка вырабляла дробныя дэталі, як вокны і дзверы. У Біра-Біджане леса многа, але не хапае транспарта, каб дае таміць лес на фабрыку. Сёлета ў нас працуюць абедзве рамы. Адна рама штодзённа вырабляе 40-48 кбм., другая — 80 кбм. Да кастрычніцкіх свят рабочыя фабрыкі пабудавалі для сябе дом на 16 кватэр і вялікі інтэрнат для халасцякоў.

Першы раз у сваім жыцці сеў у цягнік тав. ІНДУКАН — прадстаўнік калгаса, які складаецца выключна з гольдскага племені.

Тав. Індукан першы раз у жыцці ў вагоне ўбачыў яблыка. У Біра-Біджане яблыні не растуць. На працягу ўсёй зімы онег выпадае максімум 6-7 раз. А марозы вялікія, — даходзяць да 40-50 градусаў. Яблыні вымярзеюць. Дык вось, трапіўшы ў вагон, і ўпершыню ўбачыўшы яблыка, тав. Індукан, доўга і ўважліва разглядаў яго. Таксама, як уважліва глядзеў ён пяць год таму назад, калі перасяленцы пачалі вучыць людзей яго племені апрацоўваць зямлю, даіць кароў, разводзіць свіней.

— Пры арганізацыі калгаса, — кажа тав. Індукан, — далі нам 4-х коняй. Гэта ўсё, што ў нас было. Было нас у калгасе 7 чалавек. Араць, сеяць нам вельмі цяжка было — мы-к начуўнікі. А зараз мы ўжо маем 300 га сямлі і 17 коняй. Раней мы ніколі не бачылі як сеюць, як малоцяць, хлеб мы бачылі толькі ў Хабараўску на рынку. Купляць не куплялі яго. Нейжмін Індукан ён нам здаваўся. А цяпер у нас свая сталоўка, свой хлеб. Яслі арганізавалі. І комсамольскую ячэйку маем.

Гэтымі днямі было ў нас вялікае свята — свята ўвядзення рахункаводства ў калгасе. Пісьменных людзей у нас няма. Раней паслалі мы аднаго чалавека на вучобу ў Ленінград — у навучальную ўстанову Камітэта Поўначы. Гэты чалавек вярнуўся, мы другога пасылі. Так па чарзе і будзем грамадзе вучыцца. Працаўні мы запісаць не маглі, а таму рабілі скрынкі і кожнаму ў скрынку клалі палачкі. Гэтак і працадні падлічвалі. Зараз у нас свой рахункавод і мы гэта дасягненне адзначылі вялікім святам у калгасе.

Шмат аб чым расказвалі дэлегаты Біра-Біджана працоўным горада Менска. Расказвалі пра свае дасягненні, расказвалі пра цяжкасці, пра перспектывы ў будучым. Гаварылі аб тым, што працоўныя БССР плацілі яшчэ больш узмацніць сваю дапамогу ў справе будаўніцтва социялістычнага Біра-Біджана.

Наведаўшы на развітанне рэдакцыю «Звязды», дэлегаты прасілі ПЕРАДАЦЬ СВАЮ ПРОЛЕТАРСКУЮ ПАДЗЯКУ ЎСІМ ПРАЦОЎНЫМ Г. МЕНСКА ЗА ГАСЦІННЫ ПРЫЕМ І БРАЦКУЮ СУСТРЭЧУ, АКАЗАНУЮ ДЭЛЕГАЦЫІ.

Л. КАПЛАН.

***

18 лістапада ў доме Культуры адбыўся вялікі інтэрнацыянальны вечар, прысвечаны прыезду Біра-біджанскай дэлегацыі, на якім з вялікай прамовай аб задачах ВССР над Біра-Біджанам выступіў старшыня ЦВК БССР тав. А. Г. ЧАРВЯКОЎ.

Ноччу 19-га лістапада інтэрнацыянальная дэлегацыя ўдарнікаў Біра-Біджана выехала ў Гомель, пасля чаго дэлегацыя накіроўваецца ў Харкаў і на Дняпроўскую гідраэлектрастанцыю.

П. ПАСЮКЕВІЧ

Старшыня камісіі па чыстцы віцебскай партарганізацыі

Некаторыя вынікі чысткі віцебскай партарганізацыі *)

Факты зацісканя крытыкі і самакрытыкі ў часе чысткі выяўлены і ў ячэйцы ветэрынарнага інстытута, дзе былы дырэктар **Увараў** (выключан камісіяй з партыі), свядома знішчаў са стыпендыі студэнта т. **Гарбулька** за тое, што апошні яго крытыкаваў праз друк. Характэрна, што гэты дырэктар матываваў знішчэнне студэнта **Гарбулька** са стыпендыі тым, што ён і так **«зарабляе на заметках»** і таму не мае патрэбы ў стыпендыі.

У ячэйцы голкавай фабрыкі ў ходзе чысткі было выяўлена, што зацісканне самакрытыкі, сямейнасць і круговая парука асабліва працвіталі ў перыяд падрыхтоўкі да чысткі. Характарыстыкі на асобных членаў партыі былі складзены па-сямейнаму. У адной характарыстыцы гаворыцца: **«тав. Раманоўскі заўсёды адклікаўся на мерапрыемствы партыі і ўрада, хаця сарваў палітычную кампанію па падпісцы на пазыку».**

Зусім відавочна, што першая частка характарыстыкі напісана спецыяльна для змякчэння другой яе часткі. Дырэктару фабрыкі т. **Рагозіну**, які правяў работу, сістэматычна не забяспечваючы выканання прамфінплана, была дана характарыстыка нібы на хвалебнага характара. Чыстка паказала, што ў гэтай ячэйцы існавала сістэма зацісканя самакрытыкі. У выказваннях беспартыйных рабочых і радавых партыйцы (т. т. **Ступакоў, Бабушынскі**) указвалі, што да чысткі **«ў нас праўду гаварыць нельга было, бо за гэта людзі мелі непрыемнасці».**

У ячэйцы міліцыі было выяўлена, што крытыка і самакрытыка, як метад выкрыцця недахопаў і прарываў работы віцебскага гарнізона міліцыі, разгорнута не была. Нават у перыяд самой чысткі былі спробы з боку кіруючых таварышоў аперсектара група зацісканню самакрытыку спасыланнем на тое, што ў нас, маў, «сакрэтна-аперацыйныя пытанні», «шелга кампрамэтаваць камандны склад» і г. д. Позаверачная камісія быў дан рашучы бой гэтым зажымшчыкам і толькі тады пачалі выступаць, выкрываючы недахопы ў рабоце. Адсутнасць крытыкі і самакрытыкі ў ячэйцы міліцыі, праяўленне момантаў грубага зацісканя самакрытыкі стварылі абстаноўку, якая спрыяла пралязанню ў рады міліцыі класава-варожых элементаў.

На сходах па чыстцы партарганізацыі віцебскага чыгуначнага вузла крытыка і самакрытыка была разгорнута зусім невыстарчальна. Характэрна, што выступалі ў большасці ўжо працыцаваныя

Насценгазеты, якія павінны з'яўляцца арганізатарамі большэвіцкай крытыкі, у большасці ледзь існуюць. Есць выпадкі, калі асобныя газетныя «пісьменнікі» складалі ўсю газету. Так было па **«Дзвіне», на фабрыцы імя Лскерта, на шчоткамбінаце, на фабрыцы імя Клзры Цэткін.** Падмена рэдакцыямі або асобным рэдактарам масавага рабкора, — вось характэрная рыса газетнай «работы», а адсюль і адрыў газеты ад мас. На гэтых прадпрыемствах, калі склікаліся канферэнцыі рабкораў, прыходзіла па 5-6 чалавек. Не дзіўна, што на апісваемыя ў газетах факты амаль ніхто не адказваў. Фабком фабрыкі «Дзвіна» месяцамі не адказваў на пісьмовыя заявы рабочых. На фабрыцы «КІМ» — старшыня фабкома Кашнікава заявіла на адным са сходаў: **«не дазволю на сябе гаварыць».** Як правіла, спецыяльнай работы з рабкорамі амаль відзе не вялося. Газета **«Віцебскі пролетары»** чэрна кіравала ЦК і XV з'езда партыі. У практыцы сваёй работы Мускат таксама праводзіў антыпартыйную лінію.

У партколектыве шчаціннага камбіната выключан з партыі былы бундавец — член партыі з 1932 г. — **Машараў.** У 1919 годзе Машараў уступіў у рады нашай партыі, але ў 1921 годзе ён выйшаў з партыі па матывах пазгоды з нашай, а пасля ён сам пачаў ганіцьваць. Як у часе ўступлення ў партыю, так і пры сваёй чысткі Машараў утаіў сваё прабыванне ў Бундзе і тое, што ён займаўся ганцьбам у першыя гады пэпа.

Чыстка выявіла, што ў віцебскай арганізацыі мелі месца і нацдэмаўскія вылазкі. Чыстка выкрыла ў радзе навучальных устаноў яўчае ажыўленне шавіністычных нацдэмаўскіх элементаў. На падрыхтоўчых курсах **Педагагічнага** інстытута выкладчыца беларускай мовы **Гараніна** выкладала праматыку на забароненаму падручніку відомага нацдэма **Язэпа Лёсіка.** Аналагічныя факты мелі месца ў політэхнікуме і на педагагічным рабфаку з боку выкладчыкаў беларускай мовы **Шапрунова і Крывошына.** Апошні адмовіўся ад прарацоўкі са студэнтамі артыкула сакратара ЦК КП(б)Б т. **Жэбраўскага,** які сігналізаваў аб ажыўленні нацдэмаўскіх элементаў на літаратурным фронце. У політэхнікуме мела месца вылазка кулацкага агента **Цапко,** які выступіў з «таорыяй» аб тым, што **ў Беларусі** ўсе навіны размаўляць толькі на беларускай мове.

У ячэйцы міліцыі мела месца вылазка на сутнасці антысеміцкага нарадка, у насценгазеце была змешчана заметка пад загалоўкам «Соп», у якой паказвалася ў скрытых антысеміцкіх тонах жыццё яўрэяў у СССР.

Чыстка выявіла таксама і значнае ажыўленне вялікадзяржаўных элементаў. У політэхнікуме інжынер **Грыцук** адкрыта заявіў студэнтам пры заняцях, што-калі яны будуць адказваць па-беларуску, ён заліка прымаць не будзе. Гэты Грыцук наогул адмаўляў існаванне беларускай мовы. Дырэкцыі тэхнікума ён прад'явіў ультыматум, што калі будуць патрабаваць ад яго выкладання на беларускай мове, дык ён выедзе з Беларусі. Пры гэтым ён заявіў: «Я інжынер і мне няма чаго ведаць нацыянальную палітыку партыі». Гэты ад'яўлены вялікадзяржаўнік быў знят з работы. У ветэрынарным інстытуце прафесар **Пелікаў** так сама адмовіўся выкладаць па беларускай.

У радзе навучальных устаноў мелі месца антысеміцкія вылазкі. У вет. інстытуце і педрабфаку, напрыклад, распаўсюджваліся антысеміцкія песні і былі расказы пад цкаванні студэнтаў-яўрэяў (ячэйка педрабфака—студэнт **Хруцкі**).

Асабліва трэба падкрэсліць недапушчальна дрэнную пастаноўку справы інтэрнацыянальнага выхавання рабочых мас. Гэта работа вядзецца па-кампанейску, ад выпадка да выпадка. Справа выхавання мае у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма не праяўлае штодзённай работы партколектываў і ячэек. У некаторых ячэйках адсутнічае разуменне таго, што справу інтэрнацыянальнага выхавання трэба правесці і ў барацьбе за выкананне прамфінплана. Многія памылкова думаюць, што справа інтэрнацыянальнага выхавання з'яўляецца толькі справай мопраўскай арганізацыі. Характэрным прыкладам, сведчаючым гэта, можа служыць фабрыка **«Сцяг індустрыялізацыі».** Відома, што асноўнай хваробай гэтай фабрыкі быў масавы выпуск бракаванай прадукцыі. Відучы барацьбу супроць гэтага, таварышы з партколектыва фабрыкі не даказвалі рабочым, што фабрыка, выпускаючы прадукцыю дрэннай якасці, гэтым самым парушае свой інтэрнацыянальны абавязак перад рабочымі іншых абласцей Совецкага саюза.

Аб слабай рабоце па інтэрнацыянальнаму выхаванню рабочых мас гаворыць і факты адсутнасці дыферэнцыявання работы па нацыянальных мовах з рабочымі нацыянальных меншасцей. Чыстка паказала, што гэтая работа на большасці прадпрыемстваў зусім не праводзіцца. Літаратуры і газет на інтэрнацыянальных мовах выпісваецца мала. Усё гэта гаворыць аб тым, што фронт інтэрнацыянальнага выхавання рабочых мас у віцебскай арганізацыі знаходзіцца ў глыбокім прарыве.

Асноўная задача, якая пастаўлена была камісіяй па чыстцы перад віцебскай партарганізацыяй—гэта ліквідацыя адставання як у галіне выканання прамфінплана, так і ў с.-г. кампаніях. З гэтай мэтай праводзілася паўторная прарацоўка матэрыялаў па чыстцы партыі, асабліва даклад т. **Кагановіча,** і прыймаліся канкрэтныя рашэнні па ліквідацыі тых недахопаў у рабоце, якія былі ў арганізацыі ў цэлым і ў кожным калектыве ў паасобку.

Асноўны ўдар быў накіраваны на элементах дробна-буржуазнай распушчанасці і расхлабанасці, на разгільдзяях і бюрадзельніках, на элементах, расхістваючых жалезную дысцыпліну партыі. Гэта пытанне на чыстцы было ўзнята на вялікую палітычную вышыню. Узнята была таксама палітычная і вытворчая актыўнасць рабочых. У рэзультаце значная частка партколектываў і ячэек падышлі да чысткі сваіх радоў са значна лепшымі паказальнікамі ў рабоце.

Неабходна

НА НАРАДЗЕ ПРЫ „ЗВЯЗДЗЕ"

„УЛАДЗІМІРСКІЯ БАГАМАЗЫ" на ВУЛІЦАХ і ПЛЯЦАХ

Вырваць з рук халтуршчыкаў мастацкае афармленне горада!

Палітычна актуальная, глыбока прадуманая тэматыка мае велізарнейшае значэнне ў справе мастацкага афармлення нашых гарадоў, у прыватнасці — Менска. Між тым, як у дні пролетарскіх свят, так і ў агульным афармленні чырвонай сталіцы БССР мы маем шаблонны, павархоўны падыход да гэтай адказнейшай справы, маем поўную адсутнасць акрэсленай, мэтаімкнёнай тэмы.

Бяссэнсныя гірлянды лямпак, некалькі аляважата зробленых партрэтаў, паваровыя ліхтарыкі, — вузкі правінцыялізм у самым горшым сэнсе слова характарызуе сабой «мастацкае» афармленне першамайскіх і кастрычніцкіх урачыстасцей... Працоўныя Менска, які ператвараецца ва ўзорную сацыялістычную сталіцу крымежнай рэспублікі, які мае рад грандыёзных дасягненняў у паляпшэнні свайго дабрабыта, у праве патрабаваць зараз і высокажаснага афармлення горада.

Хіба могуць задаволіць непарэвальна ўзросшыя эстэтычныя запатрабаванні нашага рабочага такія «манументы», якія аздабляюць сабою плошчу ля вакзала, сквер ля Віленскага рынка, такія «вітрыны роста», як ля кіно «Чырвоная зорка», такія партрэты на вуліцах, якія жмяцуць ад першай кроплі дажджа?..

Пытанню арганізацыі і рашучага паляпшэння гэтай справы **«Звязда»** прысвяціла спецыяльную нараду, якая адбылася пры рэдакцыі 18 лістапада і сабрала каля 50 работнікаў мастацтва,—мастакоў, архітэктараў, скульптараў, лепшых фатографаў, работнікаў ВЭО і інш.

Адзначаючы зусім свяжачасовую пастаноўку гэтага пытання рэдакцыяй «Звязды», выступаючыя на нарадзе падкрэслілі, што нізкая якасць, лявусы і проста факты шкоднійства ў афармленні Менска, асабліва ў часе свят, тлумачацца ў значнай меры неарганізаванасцю справы, невыстарчальнай барацьбой з «шарадчыкамі» і халтуршчыкамі. Вялікую ролю адыгрывае тут таксама непадрэнка якасці афармлення трыбун, вітрын і фасадаў радам нашых гаспадарчыкаў. Часта з праектных эскізаў, каб скараціць колькасць роек ці іншых матэрыялаў, адным росчаркам пера выкідваюцца цэлыя фігуры.

Цікава, што менскі гарсавет найпоў у гэтым напрамку па лініі самага найменшага супраціўлення. У яго распараджэнні, па спецыяльным складзе (Нямыга, 28) ёсць цэлы асартымент трыкутнікаў і квадратаў — «узбраенне», з якім ён выступіў, напрыклад, сёлета ў гадавіну Кастрычніка, развесіўшы па Совецкай славутыя «16» (светлавыя паралелепіпеды). Гэтымі трыкутнікамі і квадратамі, у розных варыяцыях, аперуюць увесь час... Зразумела, пра павышэнне якасці, пра змаганне за тэматычнае афармленне тут і гаварыць не прыходзіцца.

Была завострана ўвага на неабходнасці прыцягвання да афармлення горада сапраўдных майстроў, на необходнасці ліквідацыі ў гэтай справе ўраўнілаўкі і абязлічкі, большага скарыстання старых мастакоў, а таксама на пытаннях арганізацыі кансультавання работ маладых майстроў.

Архітэктар **Лаўроў** зазначыў, што Менск мае ўсе даныя для сапраўдных мастацкага ўпрыгожання. Сіл хапае! Ім трэба толькі аб'яднацца і пачаць арганізаваную работу. А гэта будзе мець плённыя вынікі толькі тады, калі пры гарсавеце будзе створана адзіная архітэктурна-планавае кіраўніцтва.

Нарада выявіла недапушчальна абылкавыя адносіны да мастацкага афармлення і ўпрыгожання горада з боку саюза працаўнікоў мастацтва, саюза совецкіх мастакоў Беларусі і камбінатыва «Мастак», які ператварыўся выключна ў камерцыйную арганізацыю, у дапатак — з моцнымі элементамі групаўшчыны. Усе ўдзельнікі нарады адзначалі неабходнасць рашучай перабудовы гэтых арганізацый, а таксама падтрымлівалі думку т. Лаўрова аб необходнасці стварэння адзінай камісіі пры Менгарсавеце, — цэнтра, які стала кіраваў-бы мастацкім афармленнем горада.

Нарада, якая прайшла пад знакам шчырынага, дзелавога супрацоўніцтва работнікаў мастацкага фронта і «Звязды» павінна стаць адпраўным пунктам гэтай перабудовы.

Юр. Л-НЫ.

ПАСТАНОВА КАЛЕГІІ НК РСІ БССР

ад 20 лістапада г.г.

Праведзеным старшым інспектарам транспартнай групы НК РСІ БССР тав. ВЕРСТАК расследаннем факта прастоя на 18 лістапада 1933 г. экспартных грузаў на ст. Асіпавічы Заходняй чыгункі ўстаноўлена:

а) На станцыі Асіпавічы былі затрыманы для перагрузкі 4 вагоны экспарта з прычыны тэхнічнага брака ў вагонах: ад 30 кастрычніка вагон № 329320 песматэрыяла (фрыза) па адпраўцы № 22932 Хойнікі — Кралупы (Чэхаславакія), ад 30 кастрычніка — вагон № 399826 скіпідара па адпраўцы Быхаў — Стоўбцы (Польшча), ад 7 лістапада — вагон № 600066 песматэрыяла па адпраўцы № 3928 Мазыр — Данцыг (Германія) і ад 10 лістапада — вагон № 511658 песматэрыяла па адпраўцы № 22984 Хойнікі — Данцыг (Германія) перагрузка экспарта затрымівалася з прычыны адсутнасці і падходзе пакаёвага вагонаў, годных для следавання ў бесперагрузачных замежных экспедыцыях;

б) У перыяд 13-15 лістапада былі выпушчаны асіпавіцкім вагонарамонтным пунктам з рамонта спецыяльна пад перагрузку экспарта 4 вагоны №№ 595609, 452883, 562553 і 356188, якія дзяжурным па станцыі Асіпавічы І. ПАЛІЦІКО і тэхнічнымі канторшчыкамі яго змены ЖДАНОВІЧ і СВІДЧАНКА, замест падачы пад перагрузку экспарта, былі адпраўлены парожняком пад унутраную перагрузку прызначэнням двух вагонаў на Спуцкі і астатніх у паўнавёсным кірунку, не гледзячы на тое, што на гэтых вагонах мелася крэйдавая разметка вагона — агляднага пункта аб годнасці пад экспарт і сама прыёмка вагонаў станцыяй з рамонта аформлена ўстаноўленым парадкам; такім чынам, па віне Паліціко, Ждановіч і Свідчанка экспарт на калёсах працягваў прастойваць яшчэ на 18 лістапада, чакаючы новай падачы вагонаў з выцяжкаючай адсюль уплатай запатой валюты за далейшую пратэрміноўку ў дастаўцы;

в) Па мінулай сваёй рабоце ДСП Паліціко меў рад спагнанняў за затрыманне цягнікоў і ў апошні час — 17 лістапада дапусціў перабегі ў рабоце баластнага кар'ера 351 клм. непадачай паражняка і інш.; канторшчыца Ждановіч таксама мае рад спагнанняў за засылку вагонаў і дакумантаў, канторшчык Свідчанка быў знят з пасады нач. станцыі за здзеянне і ў далейшым з пасады аператара за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Калегія НК РСІ БССР пастанаўляе:

1. ДСП — Асіпавічы Паліціко, канторшчыкаў той-жа станцыі Ждановіч і Свідчанка за зрыў перавозак экспартных грузаў неадкладна зняць з работы, забаранёўшы ім працаваць на транспарце, і перадаць пад суд.

2. Даручыць транспартнаму пракурору Заходніх чыгунак прыцягнуць Паліціко, Ждановіч і Свідчанка да судовай адказнасці ў паказальным парадку.

3. ДЗС — Асіпавічы БАРКУНУ, на якога нач. станцыі быў ускладзен нагляд за забеспячэннем перагрузкі экспарта, абвясціць суровую вымову.

Адначасова паставіць перад палітадзелам 6-га эксплаатацыйнага раёна Зах. чыгунак пытанне аб прыцягненні Баркуна да партыйнай адказнасці.

4. ДН—6 Заходн. чыгункі неадкладна прыняць меры да прасоўвання экспартных грузаў са ст. Асіпавічы па прызначэнні.

Нам. народнага камісара РСІ БССР
КОНІК.

Нам пішуць

Работніцы некаторых менскіх прадпрыемстваў у ліку **15** асоб (**Бейкіна, Шапіра, Лакацінская** і інш.) звярнуліся ў рэдакцыю з лістом, у якім паведамляюць: «Дзіцячыя яслі **№ 7** абслугоўваюць **75** дзяцей працоўных. Яслі знаходзяцца ў веданні **менгарздрава.** Але, не гледзячы на халоднае надвор'е, памяшканне ясляй не апяляецца.

Камендант дома зусім не турбуецца, каб забяспечыць яслі дровамі, а загадчык гарздрава тав. **Нейштак,** на просьбу загадчыцы ясляй аб дапамозе, заявіў: «Я з свайго боку нічога зрабіць не магу, можаш закрыць яслі».

Такі бюракратычны падыход да законных патрабаванняў работніц і нежаданне прыняць адпаведныя меры для забеспячэння нармальнай работы ясляй з боку кіраўніцтва гарздрава з'яўляецца недапушчальным і нецярпімым. **Наркамздраў павінен тэрмінова рэагаваць на гэтыя факты.**

***

Тэхнік **Крупскага** леспрамгаса ў сваім лісце ў рэдакцыю выкрывае рад злачынных дзеянняў і слямейнасць у рабоце дырэктара леспрамгаса **Кагана,** які разбазарвае дзяржаўныя грошы. **Каган** выдаў з дзяржаўных сродкаў **1500** руб. планавіку **Манз** і **1200** руб. таксатару **Марозаву** на пабыцьё імі кароў для іх уласнага карыстання. Такім-жа сямейным парадкам **Каган** выдаў прэмію загадчыку **Ухвальскай** пошты за лесавывазкі, між тым, як гэты загадчык нішчата ўдзела ў лесавывазках не прымаў і ніколі не бывае ў лесе.

ПА СЛЯДАХ НЕНАДРУКАВАНЫХ ЛІСТОЎ

Селькор **К. П.** у сваім лісце выкрываў рад агітацый у рабоце калгаса **«Рабочы».** Усё гэта фабілася таму, што калгас быў засмечан класавымі ворагамі.

Па праверцы **смалявіцкай РКК РСІ** факты поўнасцю пацвердзіліся.

За дапушчэнне бязгаспадарчасці і непрымянцце мер да ачысткі калгаса ад кулацкіх элементаў партрэпрымацаванаму тав. **Калека** абвешчана суровая вымова.

За бядзейнасць і бязгаспадарчасць старшыня калгаса **Альшэўскі Язэп** з працы старшыні знят.

Рахункавод калгаса **Знак Андрэй** за п'янства і бядзейнасць у калгасе з працы рахункавода знят.

Загатчык СКТФ **Буо Міхаіл** за сістэматычную п'янку і нявыхад на працу, што прывяло да развала СКТФ, з работы знят і справа аб ім перададзена ў суд.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Гарком КП(б)Б сумесна з гарпрафсоветам, ЦП саюза прамкамжылбуд склікае 22 лістапада г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканні Менгарпрафсовета (заля пасяджэнняў) **нараду трыкутнікаў бударганізацый і асобных аб'ектаў будаўніцтва і актывы рабочых па пытанню скончэння плана будаўніцтва 1933 г. у сувязі з правядзеннем вытворчага паходу імя тав. Гікало.**

Запрашаюцца рабкоры.

Менгарком КП(б)Б, ГСПС,
ЦП саюза прамкамжылбуд.

ВЯСНА ПАТРАБУЕ ЗДАРОВАГА ТРАКТАРА

(На ўсебеларускай комсамольскай нарадзе)

Трактар у руках партыі стаў магутнай зброяй пераробкі старой вёскі, пераробкі псіхалогіі мільённых мас калгаснікаў, зброяй барацьбы за большавіцкія калгасы, за заможнае жыццё.

Трактарны парк у гэтым годзе працаваў значна лепш, чым у мінулым, ён адыграў велізарную ролю ў паспяховым завяршэнні сельгаспрацот. Але зроблены толькі першыя крокі. Ёсць яшчэ рад буйнейшых хібаў па ўчастку механізацыі сельскай гаспадаркі.

На ўсебеларускай комсамольскай нарадзе ў дакладзе нам. наркамзем'сектара МТС тав. **Эціна** і ў выступленнях з месц прыведзен рад прыкладаў агідней шай работы машынна-трактарных станцый. У бягучым сельска-гаспадарчым годзе па 33 МТС трактары скарыстаны толькі на палову. Па клімаўіцкай МТС машыны скарыстаны на 62,7 проц., па барысаўскай на 22,2 проц. За адзін месяц па 5 МТС зарэгістравана 4.410 галгін прастоя з-за шкодніцтваўнасці машын. Вось лічба, якая характарызуе якасць рамонта трактарнага парка. У бягомлыскай МТС з-за яўна шкодніцкага рамонта трактары больш стаялі, чым працавалі. У торацкай МТС з 36 трактараў нармальна працавалі толькі 10. Многія МТМ рабілі рамонт абы з рук абыць.

Поўная дапушчаць далей такіх здзіўленняў!

Трэба ўзняць аўтарытэт трактара на вёсцы, дабіцца, каб ён працаваў бездакорна, без перабояў, на поўную магутнасць.

Для гэтага неабходна ў першую чаргу асвоіць тэхніку трактара, дабіцца ўзорнага высокаякаснага рамонта.

Ужо зараз мы павінны разгарнуць работу МТМ, каб не было такіх выпадкаў, калі толькі ў лютым пачыналі гаварыць аб рамонце, аб падрыхтоўцы да весны. Машынна-трактарныя майстэрні становяцца зараз рашаючым участкам падрыхтоўкі.

12 майстэрняў будуць у гэтым годзе рамантаваць трактарны парк. Як яны спраўляцца з ускладзенымі на іх адказнымі задачамі? Аб гэтым гаварылі многія з выступаўшых. Той факт, што ліквідацыйскі план рамонта не выкананы з першых-жа дзён, гаворыць аб дрэннай падрыхтоўцы. На 15 лістапада адрамантавана 66 трактараў замест 235. Слуцкая МТМ выканала касцярычнае заданне па 1 проц.

Ва многім вінаваты тут МТС, якія дагэтуль не адсартавалі машын, не ведаюць, якія трактары павінны ісці ў капітальны рамонт, а якія можна рамантаваць у сябе. Далёка не ўсюды заключаны дагаворы з МТМ. Па клімаўіцкай МТМ паступіла ў рамонт замест 20 трактараў толькі 8. Пры такіх тэмпах майстэрня зарэдка работу (з выступлення тав. **МІХАЛЕВІЧА**).

З-за адсутнасці трактараў для рамонта наглядаюцца вялікія прасторі ў гагачоўскай МТМ. НКЗ і Бульбатрактарцэнтр не прымалі ніякіх мер, каб прымусіць МТС заключыць дагаворы і прысылаць машыны (тав. **КУДЫШ**).

Ва многіх МТС шалуюць месцкіцкія тэндэнцыі — яны хаваюць запасныя часткі, не даюць іх майстэрням.

Далёка не скончана будаўніцтва і абсталяванне машынна-трактарных майстэрняў. У **аршанскай** МТМ не пабудаваны падыходныя шляхі, няма кватэр для рабочых, не абсталявана сталоўка, страха працякае. У **клімаўіцкай** МТМ не скончана ацяпленне, не заклеены рамы, зацягваецца будаўніцтва інтэрнатаў. У **гомельскай** МТМ не скончан нясіці паддоні, няма задаснабжэння, дах працякае.

Большасць МТМ не электрыфікавана. Гомельскім майстэрням, замест 175 лямп адпусцілі толькі 50; неадпаравозныя заявы Электраэбыту не далі вынікаў (тав. **ШАПІРА**).

Менская МТМ не забяспечана інтэрнатамі — няма дзе змяняць рабочых, нрычым трошы на будаўніцтва не адпушчаны (тав. **ІЛЬІН**).

Полацкая МТМ знаходзіцца сярод балот, пад'язныя шляхі не пабудаваны, вельмі цяжка падагнаць машыны да майстэрні. МТМ ня мае памяшкання для ўтрымання трактараў — няма дзе пастаіць машыны. Ушаноўваюцца Бульбатрактарацэнтра тав. **ЗЕЛЬДЗІН,** які больш месяца сядзеў у раёне, нічым не дапамог МТМ (г. **СТОМ**).

Скарджаліся ўдзельнікі нарады і на недахоп інструментаў і запасных частак. Трактарацэнтры і Белсельсноб у гэтых адносінах цяжуюць злачынную бяздзейнасць. Ёсць выпадкі, калі прысылаюць дэталі, маторы без усякіх дакумантаў. Гомельскія заводы «Рухавік рэвалюцыі» і «Пролетарый» выробляюць пальцы, якія не падыходзяць да трактараў. Аршанская МТМ з'яўляецца эксперыментальнай на выраб каленчатых валаў. Якасць яе продукцыі нізкая. Многія дэлегаты адзначалі нездавальняючую работу аршанскіх майстэрняў.

Удзельнікі нарады ўнеслі рад канкрэтных прапаноў для паляпшэння работы машынна-трактарных майстэрняў. Комсамольцы павінны з'явіцца застрэль пачыкамі ў барацьбе за ператварэнне майстэрняў на ўзорныя прадпрыемствы.

Трэба арганізаваць у МТМ кантрольныя пасты з ліку лепшых ударнікаў для праверкі работы кожнага, для арганізацыі заслона супроць брака. МТМ павінны мець распрацаваны дакладны графік працы кожнай брыгады, кожнага агрэгата. Гэты графік трэба давесці да кожнага рабочага. У брыгадах трэба завесці кнігі-пашпарты, у якіх было-б адзначана, хто якую частку зрабіў, каб можна было ў любы момант выявіць вінаватых у браку. Вялікае значэнне мае разгортванне соцспаборніцтва паміж МТМ і паасобнымі брыгадамі.

Трактарысты павінны самі здаваць машыны ў рамонт, правяраць недахопы кожнай дэталі. Гэта дасць магчымасць ліквідаваць абязлічку ў прыёмцы.

Вялікую ўвагу аддала нарада пытанню **шэфства заводаў над МТС і МТМ.** Лачын гомельскіх машынна-будаўнічых і рамонтных заводаў, узяўшы шэфства над МТС, суспраў гарачае пагтрэбаванне. Перанясенне лепшага вопыта заводаў у МТМ, пастаянная сувязь і дапамога павінны адыграць рашаючую ролю ў паляпшэнні работы майстэрняў.

Участак рамонтнай кампаніі — адзін з важнейшых участкаў класавай барацьбы. Класавы вораг, як і ў мінулыя гады, будзе імкнуцца сарваць рамонт трактарнага парка. Таму праверка кадраў МТС і МТМ, рашучаяачыстка іх ад чужых, варожых элементаў — неадкладная задача. Для таго, каб забяспечыць МТМ кваліфікаванай рабочай сілай, нарада падтрымала прапанову аб мабілізацыі 80-90 рабочых-комсамольцаў для работы ў майстэрнях.

Выступалі таксама прадстаўнікі рамонтных заводаў — т. т. **РЫЎКІН** (Гомсельмаш), **ЗЕЛЬМАНСКІ** («Пролетарый»), **ПАРАВОЗНІКАЎ** («Чырвоны барацьбіт»), **ЮДОВІЧ** («Рухавік рэвалюцыі») і інш. Яны кіталі прапанову аб шэфстве заводаў над МТМ. Яны выступілі рад мерапрыемстваў па паляпшэнні рамонта і выбраду запасных частак: тут арганізацыя кантрольных пастоў, бракаваных камісій, павышэнне ролі і адказнасці прыёмшчыкаў дэталяй, прыёмка і праверка зробленых запасных частак і якасці рамонта на самім прадпрыемстве і г. д.

Амаль усе выступаўшыя скарджаліся на дрэнную работу Белсельснабрамонта. Ён даў заказы на выраб запасных частак, але не прысылаў ні чарцяжоў, ні ўзораў. Адсюль работа «ўслепую» і вялікі брак.

Гэты год рамонтнай кампаніі — падсумаваны ў пастанове нарады — павінен быць узорным у адносінах тэмпаў і высокай якасці работы. Страчаныя тысячы гадзін з-за прастояў, паломак — рас плата за дрэнную работу ў мінулым. Справа гонара комсамола — дабіцца, каб трактар пасля рамонта працаваў, як механізм гадзіннік.

Б—ў.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Усім РВК, сельсоветам, соўгасам, калгасам і МТС

25-га лістапада а 6-й гадзіне ўвечары адбудзецца **ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКА ПА ПЫТАННЮ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА НА ЛЕПШЫ ПА РАБОЦЕ СЕЛЬСКІ СОВЕТ.** Выступаюць старшыні РВК і сельсоветаў.

Рэгламант выступлення для кожнага раёна строга 5-8 хвілін, якія трэба на месцы размеркаваць паміж дакладчыкамі. Забяспечце поўную і свячасовую яўку ўсіх дакладчыкаў да мікрафона. Праверце гатоўнасць радыё-прыёмнікаў да перакліччі і зрабіце тэхнічную праверку.

РВК і райКК РСІ абязаны забяспечыць шырокае радыё-слуханне радыё перакліччі ў сельсоветах, соўгасах, калгасах, МТС, хатах-чытальнях, дамах соцкультуры і забяспечыць удзел у слуханні радыё-перакліччі ўсяго совецкага калгаснага актыва і шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Раённым газетам, шматтыражкам соўгасам і МТС. надрукаваць гэту аб'яву з мэтай шырокага паведамлення ўсім калгасам,

Адказнасць за ўсё гэта ўскладзена асабіста на старшыню РВК.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

20 лістапада, 1933 г., г. Менск.

БАЛАНС

гаспадарчых сродкаў Беларускага Дзяржаўнага скурана-абутковага трэста „БЕЛСКУРАБУТТРЭСТА" на 1 студзеня 1933 г. і параўнанне яго з даннымі бухгалтарскага баланса за 1931 год.

АКТЫЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума На 1-1-32 г	Сума На 1-1-33 г
I. АСНОЎНЫЯ СРОДКІ:		
1. Будынкі і будоўлі вытворч.	4278518—74	4933597—13
2. Абсталяван. сілав. устаноўкі, машыны і інструманты	5539682—48	6334362—68
3. Транспарт	72959—28	168811—48
4. Гаспалаўчы інвентар	282217—74	352889—40
5. Запасное абсталяванне	80147—62	84357—12
6. Жыллёвыя, гандлёвыя і інш. невытворч. будынкі	740607—40	915235—73
Усяго па I раздзелу	10994133—26	12789253—54
II. ВЫТВОРЧ. ЗАПАСЫ НА СКЛАДЗЕ І Ў ПУЦІ.		
1. Сыравіна, асноўн. і дапаможныя матэрыялы і тара	3422659—94	3176933—44
2. Паліва	75005—38	83911—0[illegible]
2. Абсталяванне для ўстаноўкі	142756—79	58331—0[illegible]
Усяго па II раздзелу	3640421—21	3319175—52
III. НЯСКОНЧАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ.		
1. Астачы незавершанай вытворч.	1719506—96	1726107—9[illegible]
2. Няскончаныя капітальн. работы.	1046237—22	339706—5[illegible]
Усяго па III раздзелу	2765744—18	2065814—53
IV. ТАВАРНЫЯ ЗАПАСЫ.		
1. Тавары і фабрыкаты (на складзе і ў пуці)	844398—16	178103—71
2. Тавары адгружаныя (і не аплоч.)	961610—08	1121983—4[illegible]
3. Матэрыялы для рэалізацыі	16585—73	97499—8[illegible]
Усяго па IV раздзелу	1822593—97	1397586—9[illegible]
V. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ.		
1. Разліковыя і асобн. рахункі ў крэдытных установах	565502—92	744400—05
2. Каса і грашовыя сродкі	12845—90	16381—99
Усяго па V раздзелу	578348—82	760782—04
VI. РАЗЛІКІ.		
1. Справаздачныя сумы	45316—03	57499—36
2. Дэбіторы	1490689—82	1401169—99
3. Няскончаг. загатоўкі	7618—63	9549—18
4. Выдаткі будучых гадоў	117706—65	87017—24
Усяго па VI раздзелу	1661331—18	1555235—77

ПРАЦЯГ АКТЫВА	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г
VII. ВЫДЗЕЛЕНЫЯ СРОДКІ.		
1. Каштоўныя паперы	6209—00	27782—50
2. Паі, акцыі і ўдзел у інш. арган	262065—35	504079—26
3. Уклады ў крэдытн. установах:		
а) у БДК	130039—76	130039—76
б) У ЦКБ са сродкаў ФУБР'а	166444—69	313444—69
4. Разлікі з НКФ па адліч. з прыбыткаў	1939315—20	2446899—88
УСЯГО па VII раздзелу	2504074—00	3422246—09
БАЛАНС: руб.	23966646—57	25310094—47

ПАСІЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА На 1-1-32 г.	СУМА На 1-1-33 г.
I. УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ.		
1. Статутныя фонды	15104634—98	15382649—65
2. Мэтавыя фонды:		
а) фонд амартызацыі	855318—22	1133387—67
б) ФУБР	563968—19	624842—58
в) іншыя	213347—86	522525—94
3. Рэзервы	428137—70	653596—32
4. Зношанасць асноўных фондаў па становішчу на 1-X-25 г.	263411—84	263411—84
а) Вытворч. значэння		
Усяго па I раздзелу	17428818—79	18580414—00
II. ПАЗЫКОВЫЯ СРОДКІ.		
1. Бюджэтнае фінансаванне	1500—00	—
2. Доўгатэрміновыя крэдыты	1085613—46	1579196—19
3. Кароткатэрміновыя ссуды крэдытных устаноў	1199080—78	355569—78
4. Крэдыторы	3213838—11	2763468—22
5. Даходы будучых год	800—00	—
Усяго па II раздзелу	5514332—35	4698234—19
III. Накапленні (прыбытак)		
1) За справаздачны перыяд	1023495—43	2031446—28
Усяго па II раздзелу	1023495—43	2031446—28
БАЛАНС: руб.	23966646—57	25310094—47

СТРАТЫ — *Рэзультаты гаспадарчай дзейнасці за 1932 г.* — *ПРЫБЫТКІ*

СТРАТЫ		ПРЫБЫТКІ	
1. Страты ад рэалізацыі тавараў і па аказаных паслугах (сальдо)	47270—90	1. Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і ад аказання паслуг (сальдо)	8339473—66
2. Страты ад ліквідацыі выбыўшай маемасці	105358—72	2. Прыбытак ад ліквідацыі выбыўшай маемасці	29438—99
3. Страты ад стыхійных няшчасняў	152—00	3. Прыбытак ад паступлення па безнадзейным даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрм. наўісканай даўнасці	64462—59
4. Страты ад спісання безнадзейных даўгоў і за пропускам тэрмінаў даўнасці	105363—48	4. Іншыя прыбыткі і даходы	550116—07
5. Іншыя страты	970958—21	5. Прыбытак ад мінулых год	98009—63
6. Страты мінулых год	820951—35		
РАЗАМ руб.	2050054—66		
Чысты прыбытак	2031446—28		
УСЯГО: руб.	4081500—94	УСЯГО: руб.	4081500—94

Асноўныя паказальнікі выканання плана	Па плану 1932 г.	Фактычна За 1931 г.	Фактычна За 1932 г.
1. Выпрацоўка важнейшых відаў прадукцыі ў натуры:			
а) умоўн. буйн. скур	435	485,8	505
б) „ дробн.	1887	2089,7	2039
в) „ абутку	3100	2856,1	2775,3
2. Валавая прадукцыя па сабекошту (у тыс. руб.).	46753	46080,7	49135
3. Зніжэнне сабекошту (у проц. да папярэдняга года)	+0,4	—	+5,1
4. Сярэдня гадавы лік рабочых і навучаюч.	5706	5990	5447
5. Адпрацаваная імі колькасць чалавека-дзён	1493322	1461816	1385190
6. Агульны фонд заработнай платы ўсяго персанала	9173	8925,1	10179,1
7. У тым ліку фонд зарплаты рабочых	7313,8	7314,6	77487
8. Сярэдня-гадавая колькасць служачых.	868	706	863
9. Агульна-адміністрацыйныя выдаткі	—	44,4	378
10. Здана ў эксплаатацыю аб'ектаў капіт. будаўніцтва ў тыс. руб. (у ты. ліку прадпрыемству)	—	4959,7	2191,4

Кіраўнік трэста **Н. ЛЕЗІН.**

Галоўны бухгалтар **Ф. КАГАН.**

Баланс разгледжан і зацверджан балансавай камісіяй НКЛП БССР і да друкавання дазволен.

За нач. ОЭС НКЛП БССР **ГОРШТЭЙН.**

НЕ ЧАКАЙЦЕ апошніх дзён ПАДПІСКІ

НА ГАЗЕТЫ:
„ЗВЯЗДА" Орган ЦК і Менск. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
„ОРКА" (на польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б.
„РАУДОНАСІС АРТОЯС" (на літоўскай мове) Орган ЦК КП(б)Б

НА ЧАСОПІСЫ:
„БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ" Орган ЦК КП(б)Б.
„БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК" Часопіс культпропа ЦК КП(б)Б.
„Работніца і калгасніца БССР" Выданне ЦК КП(б)Б.

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО СВАЯЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСАЎ

Апошні тэрмін прыёма падпіскі на снежань—26 лістапада.
Пасля гэтага тэрміна падпіска ні ў якім разе прымацца не будзе

СПЯШЫЦЕ ПАДПІСАЦЦА

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: **МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ** (Ленінская, 34, другі паверх) у гарадох—**ГАРЗЮРО САЮЗДРУКУ** і раёнах—**РАЙБЮРО САЮЗДРУКУ.** Таксама тыражнымі работнікамі саюздруку, лістаносцамі, якія маюць на гэта пасведчанне і ўсімі кіёскамі па продажы газет.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
(вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)
Сёння КАНЦЭРТ ІРМЫ ЯЎНЗЕМ
Пачатак у 9 гадз. вечара.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРНА — Вялікі замежны фільм **Калі растане снег** У гал. ролі Меры Пікфорд
Каса ад 1 г. дня

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Замежны мастацкі фільм **СПРАВА БЛЕРО**

„СПАРТАК" Каса—з 4 г. дня. — Замежны фільм **БЕЛАЯ МОЛЬ**

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр — Дзіцячы фільм **ЗАВАДНЫ ЖУК** камедыя ў 6 частках

ШКОЛА ФЗВ пры МАГІЛЕЎСКІМ ШОУКАВАЙФ-ЦЫ
АБВЯШЧАЕ
АСЕННІ НАБОР ВУЧНЯЎ

У школу прымаюцца дзеці: рабочых, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў і служачых. Узрост 17-18 гадоў.

Адукацыя—6-7 груп самігодкі. Вучні забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам, сталоўкай і прадуктовымі карткамі па 1-му спісу 1-й катэгорыі.

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ—6 м-цаў

Заявы прымаюцца да 1-га снежня 1933 г. Да заяў патрэбна прыкласці дакументы:
1) аб нарадзінні, 2) аб адукацыі, 3) соцстановішчы бацькоў і 4) заверэную анкету.

Адрас: г. Магілеў, Быхаўскае шасэ, барак 4, школа ФЗВ.

Загадчык ФЗВ **АРЗНЗОН.**

Менскі вячэрні архітэктурна-будаўнічы тэхнікум
абвяшчае набор
на 7-месячныя курсы
па падрыхтоўцы ў тэхнікум

На курсы прымаюцца асобы, працуючыя на будаўніцтве не менш 2-х год з адукацыяй 5 груп семігодкі.

Заявы прымаюцца да 1-га студзеня 1934 г. у канцылярыі тэхнікума па адрасу: Менск, вул. К. Маркса, 5.

Дырэкцыя.

Полацкі Лесазагатоўчы тэхнікум
абвяшчае зімовы набор

студэнтаў на 1 курс лесазаканамічнага адзяслення, рыхтуючага тэхнікаў-эканамістаў леспрамгасаў.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы: дведка аб соцстановішчы (для аднаасобніка—акладны ліст на 33 г.), метрычная даведка, пасведчанне аб адукацыі, вайсковы дакумант, анкета, заведчаная сельсаветам, 2 фотакарткі і 45 к. паштовых маркаў. Заявы прымаюцца да 5 студзеня па адрасу: гор. Полацак, вул. Фрунзе, Лестэхнікум.

Іспыты будуць праводзіцца з 15-I-па 20-I-1934 г. па грамадзязнаўству, матэматыцы, фізіцы, беларускай мове і хіміі. Пачатак заняткаў з 7-II-1934 г.

При тэхнікуме ёсць уласная сталоўка. Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй ад 30 руб. і вышэй, у залежнасці ад паспяховасці.

Дырэктар тэхнікума **ВЕЛОВІЧ.**

КВАТЭРУ а 3-пакоўй з кухняй у цэнтры гораду **БАБРУЙСКУ МІНЯЮ** на кватэру **УМЕНСКУ**

Звярнуцца: рэдакцыя газеты „Звязда", тав. Грынглазу, тэл. № 21-357.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫ" з 21 лістапада замежны мастацкі фільм
ЦЫГАНКА МАРЦІНА
(гішпанская танцаўшчыца)
кіно-раман у 8 част.
У галоўн. ролі **ПОЛІ НЕГРЫ**
Зверх праграмы Саюзкіно-журнал № 25
Пачатак 1 сеанса у 6 гадз. веч.
Каса адкрыта а 4 г.

Беларускае Адд